Уладзімір
Марук



# КУДМЕНЬ



Уладзімір
Маручк

# КУДМЕНЬ

Вершы

Мінск
«Літаратура і Мастацтва»
2011

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
М30

**Марук, У. А.**
М30 Кудмень : вершы / Уладзімір Марук. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. — 160 с.
ISBN 978-985-6994-55-8.

Назву гэтаму зборніку, падрыхтаванаму пры жыцці Уладзімірам Маруком (1954—2010), дало даўнейшае, забытае слова, якое, калі вымаўляць яго ў сучасным пераўстварэнні, азначае амулет, абярог. У сваіх вершах аўтар засяроджваецца менавіта на тым, што ў нашым жыцці самае галоўнае, што з'яўляецца яго абярогам ад бездухоўнасці, пошласці, несамавітасці. Шукаючы суладдзя паміж чалавекам і светам, роздумна імкнучыся спасцігнуць сэнс чалавечага існавання, паэт часта адыходзіць ад звычайных быційных праблем і скіроўвае сваю думку да тэм вызначальных, паняццяў абстрактных: жыццё і смерць, дабро і зло…

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-6994-55-8**

© Марук У. А., 2011
© Афармленне. РВУ «Літаратура і Мастацтва», 2011

## СЛОВА ЧЫСТАЕ, ЯК ПЕРШЫ СНЕГ

Слова «кудмень» — даўняе і, на жаль, многімі забытае. Таму часцей ужываюцца іншыя блізкія яму па значэнні: амулет ці абярог. Уладзімір Марук для сваёй чарговай кнігі выбраў такі варыянт, які быў бліжэй да сэрца. Гэтае слова добра запомніў з маленства, бо не адно пакаленне карысталася ім у яго родных мясцінах.

Родныя мясціны У. Марука — Ганцаўшчына, а калі быць канкрэтным — вёска Гута, дзе ён нарадзіўся 6 студзеня 1954 года. Ганцаўшчына — гэта, як вядома, Палессе. А пра Палессе можна шмат гаварыць, але каб мець пра яго больш поўнае ўяўленне, дастаткова пазнаёміцца з казкамі, паданнямі, легендамі, запісанымі слынным даследчыкам вусна-паэтычнай творчасці беларускага народа Аляксандрам Сержпутоўскім, а таксама з першай часткай трылогіі песняра Беларусі Якуба Коласа «На ростанях» — «У палескай глушы». Канстанцін Міхайлавіч настаўнічаў у тамашняй вёсцы Люсіна, таму добра ведае тыя мясціны. Гэта такі куток, які проста нельга не любіць. Тым больш — калі ты нарадзіўся тут. А чалавеку, які адораны адпаведным талентам, проста грэшна не стаць паэтам. Таму і абраў сабе такі жыццёвы шлях Уладзімір.

Скончыўшы Маўчадскую сярэднюю школу-інтэрнат, ён у 1970 годзе паступіў у Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум. Зразумела, што ў сцены гэтай навучальнай установы прывяла яго любоў да літаратуры і, у прыватнасці, да паэзіі, якой захапіўся яшчэ ў школе. Пасля заканчэння тэхнікума працаваў ва ўстановах культуры роднай Ганцаўшчыны — у Шашкоўскай сельскай бібліятэцы, у раённай бібліятэцы, загадваў аўтаклубам. Потым была вучоба на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна, праца настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе № 106 горада Мінска. Далейшы свой лёс У. Марук звязаў з журналістыкай: карэспандэнт, загадчык аддзела літаратуры і мастацтва рэспубліканскай газеты «Звязда». Добра засведчыў сябе і на выдавецкай ніве. У прыватнасці, працаваў у выдавецтвах «Юнацтва», «Мастацкая літаратура». З 2003 года і да апошніх дзён Уладзімір быў намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Полымя».

Кнігу «Кудмень» ён прапанаваў выдавецтву «Мастацкая літаратура», выпусціўшы ўжо тры паэтычныя зборнікі — «Зоркі ў кронах», «Ліст рабіне» і «Інкрустацыя голасам». Важкія набыткі меў у галіне дзіцячай літаратуры, а таксама нямала перакладаў. Рукапіс «Кудменя» быў не толькі ўхвалены, але і падрыхтаваны да друку. Больш за тое — нават падпісаны ў друк, яго выхад планаваўся ў 1996 годзе. Аднак гэтая кніга У. Марука так і не пабачыла свет. Прычына да банальнасці простая: сёння кнігі паэзіі мала за-

патрабаваныя, у выдавецтвах з іх распаўсюджваннем заўсёды ўзнікаюць праблемы. Таму і даводзіцца некаторым аўтарам чакаць выхаду сваёй кнігі шмат гадоў. Валодзя, на жаль, яе так і не дачакаўся. Ён памёр заўчасна 23 студзеня 2010 года.

Зборнік вершаў «Кудмень» выходзіць ужо без яго, але ў тым выглядзе, у якім ён мог пабачыць свет пры жыцці аўтара. Таму яе ні ў якім разе нельга ўспрымаць як лебядзіную песню паэта. Да гэтай кнігі трэба ставіцца як да чарговага зборніка, бо пасля «Кудменя» У. Маруком было напісана нямала новых вершаў, аб чым, у прыватнасці, засведчылі ягоныя прыжыццёвыя падборкі ў штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», часопісах «Полымя», «Маладосць», а ў перакладзе на рускую мову — у «Нёмане». Дый пасмяротныя публікацыі шмат у якіх выданнях таксама гавораць на карысць таго, наколькі гэта быў цікавы, самабытны паэт. Не проста таленавіты, а надзіва патрабавальны да слова.

У падобным стаўленні да пісьменніцкай працы У. Марук быў блізкі Алесю Пісьмянкову. Яны не проста былі добрымі сябрамі, іх аб'ядноўвала яшчэ і жаданне брацца за пяро толькі тады, калі ў гэтым узнікае ўнутраная патрэба. Іхнія душы працівіліся вершам «прахадным», творам-аднадзёнкам. Нават тое, што магло б выліцца ў цікавыя творы, нярэдка заставалася толькі ў накідах, зробленых для сябе, без разліку на тое, каб з цягам часу гэта абнародаваць.

Дарэчы, сярод твораў, што пісаліся яшчэ да «Кудменя», у паэта ёсць верш, які так і на-

зываецца «Недапісаныя вершы». Аб высокім мастацкім узроўні гэтага верша сведчыць тое, што ён уключаны ў трохтомную «Анталогію беларускай паэзіі». Так і хочацца прыгадаць колькі строф:

Вы не далі зняверыцца ў жыцці.
Я так хацеў, каб вы былі са смною
Вялікай, неадольнаю сцяною,
Што нельга, смерць мінуўшы, перайсці.

Я вашыя вяршыні не чытаў,
За вашы мне не сорамна вяршыні,
Як небу за высокі колер сіні,
Якога аніхто не патаптаў.

А мукі вашы я не разумеў,
Пакуль ад вас не дачакаўся болю,
Вы ціхенька прасіліся на волю,
А я на волю адпускаць не ўмеў.

Гэтыя, кажучы словамі самога У. Марука, «недапісаныя вершы» не толькі не далі яму «зняверыцца ў жыцці», яны (а гэта становіцца відавочным, калі знаёмішся з кнігай «Кудмень») падштурхнулі яго да напісання іншых вершаў, для з'яўлення якіх неабходны пэўны імпульс, а ён магчымы пры ўмове нечаканага ўнутранага зруху, які ёсць, відаць, вынікам чагосьці нерэалізаванага. Натхненне, што пры гэтым узнікла, спрыяе нараджэнню новых задум. Яны ж, як і трэба чакаць, у асноўным тычацца таго, што найбольш характэрна для ўласна аўтарскай манеры.

Таму невыпадкова ў «Кудмені», як і ў папярэдніх кнігах У. Марука, так уражваюць вершы,

напісаныя, здавалася б, някідкімі акварэльнымі фарбамі. Аднак гэта творы, якія ўбіраюць у сябе так шмат, што пры ўсім жаданні сваімі словамі дакладна пераказаць іх — немагчыма. Для гэтага трэба быць ПАЭТАМ. Як, скажам, у гэтым безыменным вершы, у якім адчуваеш само дыханне прыроды: «Дзень як дзень. // Ды цямнець // Пачынаюць прылескі. // Сонца будняга медзь // Сыдзе ў вечара фрэскі. // Парушынкі святла // На нябёсах асядуць, // Паглядзіць з-пад крыла // Птушка з роднага краю. [...] // І дарога да воч, // Як лязом, дакранецца — // Бы апошняя ноч // Для жыцця застаецца».

Хораша становіцца і пасля таго, як уваходзіш у «Лес» У. Марука:

Першы шлях.
І няходжаны Млечны.
Прыпыніліся ў лесе шляхі.
Гэты лес —
недасяжны, як вечнасць.
Гэты пень —
абуральна глухі.

Паэта няма, але яго жыццё працягваецца. Дзякуючы і гэтай кнізе, якая, несумненна, знойдзе свайго ўдзячнага чытача. Увайшоўшы ў свет вобразаў У. Марука, спасцігнуўшы ягоную паэтычную прастору, чытач відавочна, па-новаму ўспрыме некаторыя творы: не так, як бы зрабіў гэта пры жыцці аўтара. Іначай і быць не можа, бо цяпер, на той адлегласці, што аддзяляе нас ад напісання іх, а ў большай

ступені адлегласці, што падзяляе нас і яго, які ўжо адышоў у вечнасць, спасцігнуў сэнс яе, — у большай ступені, чым гэта рабіў бы раней, успрымаеш тое, што патрапляе пад вызначэнне падтэкст. Больш за тое, спакваля пачынае высвятляцца і такое, што, магчыма, іншым разам і не заўважылася б. Прынамсі, на такія думкі наводзіць верш «***Самоты краскаю гаркаваю...», які, безумоўна, у гэтай кніжцы адзін з лепшых:

Самоты краскаю гаркаваю
Кранецца скроні чысціня.
А гэта ж я над светам плаваю,
Мінаю кветнік і вішняк

Над непагодліваю плютаю.
Зусім забыўшыся на скон,
Я над людскім здзіўленнем лютую,
Як несхіляны людствам склон.

Ды, бы знямоглы, раптам падаю
Ў чыюсьці мяккую далонь.
І нейчы дух самотны радую,
Што і ў мяне ўдыхнуў агонь.

Так шмат у гэтых радках той адкрытасці, якая набывае сваю сапраўдную існасць менавіта з агледзін сённяшняга дня. Адчуваецца і пэўная непрыкаянасць, як было сказана пры жыцці паэта, ягонага лірычнага героя, а цяпер жа без сумнення можна сцвярджаць, што «несхіляны людствам склон» — ён і толькі ён сам. Таму ад знямогі «падае ў чыюсьці мяккую ладонь» ніякі і не лірычны герой, а чалавек канкрэтны,

рэальны — У. Марук, якому заўсёды так хацелася спагады, цеплыні, якой, на жаль, не заўсёды стае ў гэтым тлумным і несправядлівым свеце. Асабліва тады, калі ты не такі, як іншыя. А У. Марук і быў не такім, як пераважная большасць з нас, простых смяротных.

Ён быў паэтам. Паэтам, якому да ўсяго іншага, прагнецца абсалютнай чысціні. Калі ж чагосьці асабліва хацець, то яно абавязкова збываецца. Таму і нават «Самоты краскаю гаркаваю // Кранецца скроні чысціня».

Ён і жыў гэтай прагай чысціні да самага апошняга дня. Дый адышоў у лепшы свет зімовай парой, якую вельмі любіў. Сведчаннем таму і некалькі вершаў пра зіму, што таксама ўвайшлі ў «Кудмень». З іх найбольш уражвае «Першы снег».

У дзень пахавання паэта зранку прайшоў ужо далёка не першы снег, а к сярэдзіне дня стала сонечна-сонечна і прыціснуў даволі моцны мароз. Ды і ветрана было. Аднак тым, хто добра ведаў творчасць У. Марука, прыгадваліся радкі менавіта з верша «Першы снег». Бо яны не толькі пра першы снег:

> Падае,
>           быццам лёс,
> Што нечаканы самы...
> Ды ягоных нябёс
> Не дастанеш вачамі.

Дзесьці ў гэтых высокіх-высокіх, а таму і далёкіх-далёкіх нябёсах, лунае цяпер душа У. Марука. Сам жа паэт па-ранейшаму з намі. Дзякуючы

і гэтай кніжцы. На жаль, у жыцці ягоны кудмень аказаўся не такім і ўсясільным. Не засцярог яго ад заўчаснай смерці. Затое, я веру, гэты амулет у яго даўняй беларускай назве стане для чытача, чуйнага да сапраўднай паэзіі, абярогам ад бездухоўнасці, амаральнасці — усяго таго, з чым змагаўся сваім словам У. Марук.

У добры шлях «Кудмень».

Алесь МАРЦІНОВІЧ



# Без «Я»

* * *

Па залатых валоках жыта
Залётны вецер коціць звон.
Якая памяць не пражыта,
Якія дні ідуць на скон?

І пошум жыта спавядальны,
І вечны сэнс птушыных крыл
Акрэсляць лёс,
як герб астральны, —
На ўвесь няблізкі небасхіл.

* * *

Як доўга, як пакутна быць хвілінай,
Карою дрэва
ці разгадкай снам,
Цвяліць душу скупою боскай глінай
І дачакацца месца ля вакна,

З якога ўбачыш,
як хвіліна плача
І кропляй сну палае на кары…
І толькі гліна, як чужая ўдача,
Ў душы чытае,
бы ў лемантары.

І што магчыма,
зразумець няможна,
А немагчымым жыць не дасць знаццё:

Перад табою —
свет вакна астрожны,
А за вакном —
хвіліна —
як жыццё.

## ШАЛІ

Нас не апошнія куміры
Вядуць у бездань за сабою.
Кладуць на шалі дэцэмвіры
Пачуцці разам з галавою.

Гурмою мосцімся без страху
На шалі —
быццам на арэлі:
Мы не адну мінулі плаху,
Не аднаго сабаку з’елі.

Аб нас разбілі сэрцы кралі,
Не прыпынілі нас слязою.
Мы столькі душаў абабралі,
Ды мала маем за душою.

І не апошняя завея
Услала выстылыя вочы.
Туды, дзе далеч бранзавее,
Ляціць наш дух,
ажно якоча.

І рэшткі веры —
хай не муляць —
Распяццем кінем на скрыжалі…
І не заўважым —
перакуляць
У бездань грэблівыя шалі.

## ПЫТАННІ

Апошняя цыгарка.
Ды і прэч
Шалёныя пытанні да эпохі.
Жыццё —
такая прывідная рэч,
Не ўплішчыш у няўстойлівыя лёхі.

Шалёныя пытанні…
Ды калі
Цябе яно, шаленства, напаткала?
Калі стаялі смутку каралі
З працягнутай рукою ля вакзала?

Калі тваёй прыстойнасці князі
Не зараблялі медзяка на слова?
Ты падымаўся чысценькі з гразі
І думаў,
што благое — выпадкова.

Калі астатняй волі жабракі
Перапынялі сведкаў адзіноты?

Ды ўсе ўцякалі,
                    бытта пацукі
У шчыліны,
                мінаючы цянёты.

Калі?..
        Ды ўжо апошняе «калі»
Перапыняюць новай квадры здані,
Яны й жыццё б, напэўна, аднялі,
Калі б не заставаліся пытанні.

* * *

Паветра ісціны бясконцай
Цячэ праз вязніцы і храмы.
Не прыхаваць яго ў скарбонцы
І не прыдбаць за грошы ў краме.

Яно не месціцца зазвычай
У чыйсьці гонар адмысловы,
Яно не кожнага пакліча,
Як першавызнанае слова.

Які б ні быў
                і зух, і ўпраўны, —
Яго павеў з душы не сцерці…
Дзе пачынаецца няпраўда,
Там і канчаецца бяссмерце.

* * *

Так павольна, як слімак,
Выпаўзае сонца з хмар.
Гэта ж столькі разявак
Наш зямны таптала шар.

Ўдоўж і ўпоперак прайшлі
Да апошняе мяжы,
Каб засведчыць,
що былі —
Нібы мох той на крыжы.

Сонца,
ты ж для ўсіх гарыш,
Бо ці іншы б столькі жыў,
Каб не той,
хто гэты крыж
У пакутах заслужыў.

* * *

Звіняць пераспелыя травы.
І час да травы прытуліцца,
Бо смак яе кісла-гаркавы —
Як сон недаспелых брусніцаў.

Не дорыць яна фіміяму.
Не кожны смяротны здалее
Чытаць,
як класічную драму,
І слёзы яе,
і надзеі.

Не кожнаму выпадзе лёсу
Вось так,
                у абдымкі з травою,
Ляжаць і паліць папяросу
І помніць —
                    ляжыш над жарствою.

І думаць, да змогі, бясконца.
Мяняючы воблакаў слайды:
А што,
            калі спыніцца сонца
За некалькі ісцін да праўды?

* * *

Стары бруковы камень
Ляжыць каля дарог,
Запэцканы нагамі
Хвілінаў і эпох.

Пасмоктваючы пернік,
Сядзіць на посным пні
Сярдзіты немавернік,
Кідае ў крушні дні.

Як шнары на піраце,
Бярэ гады на ўлік
Даўно забыты кацер,
А сёння — ерэтык.

Пажадліва і чынна
Агледзіць свой нароб.
І не крануць маршчыны
Яго каменны лоб.

І рукі выцірае
Аб холад рукава,
Нібыта шлях да раю
Сабе забрукаваў.

* * *

Апошнія прывіды
выйшлі з маёй даўніны —
Абшарнікі духу
і прадказальнікі драмы…
Пачвары зямныя
сняць марсіянскія сны,
А зброднi сляпыя
паўзуць да відушчае брамы.

Халодную свечку
вымае псяюк з-за спіны
І ўсё, што ні ўбачыць, —
кусае, хапае, хавае.
Як заяц натурлівы,
гойстрыць паяц скабланы
І маскі са свету
здымае, скідае, зрывае.

А ўслед за паяцам
лятуць і лятуць кажаны
І ў вочы плююць,
каб ніхто не запомніў вачамі,
Што ў вечную далеч
назахап вяслуюць чаўны —
Абшарнікі духа
і прадказальнікі драмы.

## МЫ

Мы — аўтары бойкі,
стваральнікі звады.
І нашым прыдумкам
не мае мяжы.
Мы — коткі ручныя,
мы — слізкія гады.

Хто з мяккага воску,
хто з цвёрдай пароды,
Губляем, знаходзім,
ідзём ды бяжым.
Мы свет набліжаем
да нашае ўроды.
Шукаем дарадцы,
ды кожны — чужы.

Паверылі слову,
не верым у шлюбы,
Забралі ад лета —
для доўгай зімы…

І ўсе паасобку
спяшаем да згубы,
Хоць смерць,
як сцвярджаем,
стварылі не мы.

## ПАМЯЦЬ

Разагнаная, бы кола,
Рызыкоўная дазвання,
Незбыткоўная назола,
Пераборлівая панна.

І, як вогнік, варушкая,
Пахаджалая па свеце —
Як збяднелы дух Капшая,
І багатая, як смецце.

Суніманая пагрозай
І забраная пяшчотай,
Ты не можаш быць цвярозай
І п’янкой не будзеш слотай.

Незаўважная адсутнасць —
Як душа ў памерлым целе…
І апошняя —
як шэлег.
І адзіная —
як сутнасць.

* * *

Птахі ў небе спыніліся,
Нібы ўбачылі снег,
Як святыя на крыласе,
Сустракаючы грэх.

Кожны думае:
                                        вольны я,
А як гляне наўкол —
Скрозь лятаюць няўмольныя
То анёл,
                    то арол.

Скрозь спыняе то шэрае,
То кулак,
                    то партрэт…
Воля скончыцца вераю,
Што ратуеш Сусвет.

* * *

Даўно не стаяць прада мною
Наетыя твары з газет…
Схуднелы, як дрэва вясною,
На неба жагнаецца дзед.

Трымае ў руках капялюшык
І разам з травою трымціць.
Астатнія ўсохліся душы,
І толькі й жадання —
                                                не жыць.

А вочы —
адцінкі планеты —
Іскрацца радзей і радзей…
Ды ёсць яшчэ ў позірку гэтым
Агонь, што гуртуе людзей.

І дзіўна —
дарога прамая,
Што здаўна вядзе на клады,
Яго на далоні трымае
Імгненне.
Хвіліны.
Гады.

* * *

Доўга падае снег,
На галлі наліпае.
Колькі звабных уцех
Ад вачэй засланяе.

І сумненні суняць
Ды адпрэчыць ахвота,
Бо гняце чысціня
Горш,
чым позняя слота.

Ды спяшацца дарма
Перахоўваць пралікі, —
Выкрывае зіма
Нашы цёмныя лікі.

* * *

Ўвасланы рыдзелямі схілы
Тае міфічнае гары,
Якою трызняць да магілы,
Аж не заснуць,
правадыры.

Куюць мячы,
не моўкнуць коўні,
Дарадцы льюць чароўны ўзвар…
А за спіной стаіць шаноўны
Іх не апошні валадар.

А на вяршыні свеціць сонца,
І добра бачыцца здалёк,
Што на яе,
як абаронца,
Садзіцца звабны матылёк.

* * *

Заначэла.
І неба ў садку не відно.
Захінае ад свету лісцём папяроўка.
Загрукоча цягнік,
як аб стол даміно,
Ды ляціць па каханне чыясь матароўка.

І ні зоркі,
ні следу на зорных шляхах, —
Неадольнасць самоты
і зведанасць скрухі.

Ды і цемра не ўтоіць у зыркіх вачах
Пераменлівых дрэў
                                        сексуальныя рухі.

І апошні цвыркун,
                                        бы які варажэй,
Завінецца,
                    ды раптам нібы анямее.
І вяртацца пад неба
                                        цяжэй і цяжэй,
Бо не кожны прад вечным
                                                  сябе зразумее.

## ПТАСТВА

Крылаты разлад сярод птаства,
Надрыўна крычаць, як і мы.
Хоць мы найвышэйшая каста,
Што помсна завецца людзьмі.

І ў іх мітусня і таўкота,
І бы на зямлі
                              і ўгары
Бяздумна блюзнерыць блазнота,
І неба мятуць смецяры.

І пешчы вачэй галубіных —
Як цноты зямное напой,
Смяротныя корчы,
                                        і кпіны,
І почат у кожнага свой…

Усё патуранае,
                    рыхтык
Ад нашых узятае слоў.
Шыхты нехлямяжых і сытых
Вайною ляцяць на арлоў.

І ўжо ні малітва,
                    ні клятва
Не могуць нікога спыніць,
Бо нават вышэйшая каста
Стамілася свет бараніць.

## ІСНАСЦЬ

У даліне нашай існасці
Вецер вольнасці шугае.
Ды ніяк не можам вынайсці
Ключ,
          што існасць адмыкае,

Праз якую столькі страчана
Думак, вобразаў і светаў.
Існасць бліснe непрадбачана,
Як з-за воблака камета.

І асветліць нашы дрыжыкі,
Як і здзіўленыя вочы.
Пацалуе нашы крыжыкі
Ды растане сярод ночы.

Дзікай цененькаю рыскаю
У нямых вачах сканае…
А ў далоні ключык бліскае…
Адмыкаць ім як —
не знаем.

* * *

Апошні чацвер існавання
На свеце, што мае назоў
Такі неадольны —
«Змярканне».
І ўсё пачынацьмем з азоў.

І сонца казырнае слухаць,
Што выліжа цень з камяніц,
І ўсё непарушнае рухаць
Да самых святых таямніц.

Адрозніваць боскае з мноства,
І кроў ад яго запаліць,
І ўчора нажытае ўбоства
У ісціны кроплю адліць.

* * *

Віно не выпіта.
Яно
Гарчэе ад віны,

Што рэчка плыткая даўно
Не рухае чаўны.

Упала чарка.
Свой абрад
Не скончыла яна.
А час,
нябачны, як нітрат,
Плыве з рачнога дна.

Наўкол —
планеты круглы твар,
Куды ні кінь пагляд…
Ды завіхаецца вудар
Пайсці за далягляд,

Дзе нашых твараў не відно,
І хваля не маўчыць,
І непадробнае віно
Не так вінoй гарчыць.

## ЛЕС

Пешы шлях.
І няходжаны Млечны.
Прыпыніліся ў лесе шляхі.
Гэты лес —
недасяжны, як вечнасць.
Гэты пень —
абуральна глухі.

Не спаганена трасцай і тлумам
Размаітасць лясное душы.
Тут збіраюцца вольныя думаць
І аблуды прыходзяць грашыць.

І ўзнімаецца лес па збавенне
Пад спагадлівы купал нябёс,
Тут глыбокае сэнсу карэнне
Выпраўляе сусветны хаос.

* * *

Упэўненасць прыходзіць і мінаецца.
Куды ні глянь —
скрыжалі ды скрыжалі.
І кожная хвіліна пачынаецца
З акрутных слёз,
якія свет бажалі,

Маліліся, як дзеці пазашлюбныя,
Упрошвалі закон і справядлівасць
Забыць на чалавецтва звычкі згубныя
І не зважаць на іхнюю ліслівасць.

Ды бачылі,
як хвілі час высноўвае,
І кожная —
высокага жадае,
Ды зваблівае неба перуновае
Не кожнай і не сёння выпадае.

## ЧАКАННЕ

Даўно стаім як перад крыжам,
Нібы ўваскрэслі з небыцця,
А сярод нас цікуе віжам
Маруднай сталасці дзіця.

І кожны мудры, як варона,
Што памірае на крыжы,
І белы свет, як хлеб свянцоны,
Крамсаюць позіркаў нажы.

А з неба пойдзе снег, як вырак,
За слова звыклае «люблю»,
І ўсе падхопяцца, як вырай, —
І тут жа ўпадуць на зямлю.

* * *

Так вусцішна,
                    дзе светлае знікае.
Паміж святлом і цемрай заблукаць —
Не так трывожна і не так злякае,
Як немагчымасць выйсця адшукаць.

Так вусцішна.
                    І боязна змяркання.
І так балюча свечку патушыць,
Бы саграшыць —
                    і прагнуць пакаяння,
Пакаяцца —
                    каб зноўку саграшыць.

* * *

На прысмерку я ў ваш прашуся сон,
На досвітку я вашых сноў баюся,
Як мора,
па якім паплыў Ясон,
Як праўды,
што да вас я не вярнуся.

На прыцемку патухне мельхіёр,
Як на світанні ў вазе хрызантэмы,
За ноч не перажыўшы ваш дакор,
Далёкі ад багоў і ад багемы.

Сутонее…
А ваш маўчыць камін,
На золаку не бліснe ў ім вуголле.
На ваш абрус усеўшыся,
паўлін
Спраўляе патаемнае застолле.

Змяркаецца —
бы праляціць жаўна.
Святлеецца —
бы праплывае лебедзь.
І вашы сны,
як з воску даўніна,
Мае абрысы стомленыя лепяць.

Спыняюся,
бы свой пачую стогн
Працяглы —
ад змяркання да світання...

Сцямнела —
                    і мяне шукае сон.
Развіднела —
                    і ў сон няма вяртання.

* * *

Мы не выйшлі з пячор
Са сваімі грахамі.
Як сляпы дырыжор,
Ходзіць розум між намі.

І трымціць яго цень.
Толькі сослепу верыць,
Што абрынецца дзень,
Як на голаў сякера.

І, як кроў, закіпіць
Прад вачамі збавенне…
І адмовіцца жыць
Не адно пакаленне,

Што спяшала да зор,
Каб душу перайначыць…
Мы выходзім з пячор.
А як выйдзем — ці ўбачым?

## КУЛЯ

Куля пройдзе скрозь цябе
І праніжа грудзі клёну.
Дыядэмай на ілбе
Загарыцца кропля скону.

Прыкаваны да травы
Твой апошні крок да волі.
Пахам цнотнае жарствы
Клён сваю бяду спатоліць.

Малітоўны голля спеў
З белым светам развітае.
І спаведнік не паспеў —
Куля ўсё ж хутчэй лятае.

## СМЕХ

Перапытаць не раз, а колькі,
У лёсу выведаць не грэх
Пра досціп свой нязвыкла горкі,
Пра свой
                    такі акрутны смех.

Спытаць і чуйна, і адчайна…
І ажыве між глейкіх дум
Усмешкай выкрытая тайна,
Жыццём распятая на тлум.

Смяешся…
Даць не можаш рады
Сваім дарадчыкам ліхім,
І чарвякі, смаўжы ды гады
Твае падточваюць грахі.

Яны пад маскамі паяцаў
Казычуць, смокчуць і грызуць,
А ты асуджаны смяяцца,
Сухой каўтаючы слязу.

* * *

Пыл дарожны над полем —
Цэлы дзень,
поўны лёс.
Гэты лёс не адмолім
Ціхім рыпам калёс.

Пашарэе, зашэрхне
Лісце часу ў садах.
Гэта толькі паверхня,
А нутра —
не відаць.

Толькі ветру павевы,
Што страсаюць з душы
Пыл —
на поле, на дрэвы
Ды пад колы машын.

І ніякай святліны,
Што падкажа знарок:
Пыл —
                    не з боскае гліны,
А з нялюдскіх дарог.

## У БАЛЬНІЦЫ

Паветра рызыкоўнай клінікі
У нашы грудзі ўпакавана,
Па тэлефоне пішуць цынікі
Канец службовага рамана.

Цвіце аблудніца багемная
Усмешкай хворае мілосці,
Бы верыць —
                                    гойны час аклемае
У цела ўплішчаныя косці.

Заняты тварамі, як шыльдамі,
Па іх чытаю-паўтараю,
Якое веры хто і гільдыі,
Хто завяшчае мошчы раю.

І, як прычасце, раскаштоўваю
Смак падгарэлай кашы маннай.
І сон наявіцца паштоўкаю
Ад літасцівага шамана.

І ноч прылашчыцца наўлечкаю,
І анікога не ахае.
А свет паветра невылечнае
Праз нашы лёгкія ўдыхае.

* * *

Гняло бяссонне.
                    Сны не сніліся.
Хоць пі які чароўны ўзвар.
Ноч у глухія шыбы білася.
Маўчаў,
          як вісельнік, ліхтар.

А пух нашэптваў пад наўлечкаю,
Нібы крыўдлівай ночы дух…
І як асмеліўся —
                    за рэчкаю
Агонь успыхнуў.
                    Ды патух.

Нібы паганец непахрышчаны,
Што пасміхаецца здалёк
На першавызнаныя ісціны,
Што саматужна спеліць клёк.

Стаяць яны,
          як дрэвы голыя,
Як схімніцы перад грахом,

Нясмелыя,
яшчэ бясполыя,
Перад патухлым тым агнём.

Яны не просяць і не просяцца,
Яны не маюць столькі слоў,
Што за любою іскрай носяцца,
Пяюць пра вернасць і любоў.

Яшчэ іх доля лебядзіная
Не перастрэла, як знаццё,
Што асвятляе ўсё адзінае
Святло — пад назваю Жыццё.

## НА КЛАДАХ

Якіх не было гадоў —
Цкаваных, крывавых, дзікіх?
Узнімецца гнеў з кладоў,
І чуйныя,
бы музыкі,

Нашчадкі чужой віны, —
Абрынуцца душы продкаў.
І кінуцца,
як ад вайны,
У воблакі,
як у лодкі.

І выплывуць у абсяг,
Дзе вольнаму волі досыць,
Дзе сонца, —
                    як вечны сцяг, —
Над светам іх памяць носіць.

## ВУЖЫ

> Зіхацяць маёй кароны
> Залатыя рожкі.
> *М. Багдановіч*

З балота выпаўзлі вужы.
Глыжы пашыліся ў балота.
Аеру рэзкія нажы
Крамсалі дрогкую дрымоту.

Іх цар у багне дадыхаў.
І пасварыліся вужакі:
Хто нема выў,
                    а хто брахаў,
Гырчэў з ухваткамі сабакі.

Дзялілі гразкі свой абшар,
Ажно з гразі павыпаўзалі,
А ўслед за імі…
                    іхні цар,
Якога ў думках пахавалі.

І перасталі выць, брахаць,
Гырчэць з распустаю сабачай,

Бы і заўжды —
                      адно сіпяць,
Як прад сабой карону бачаць.

А цар завыў
                  і затрымцеў,
З кароны знікла пазалота…
Ды ўжо ніхто не захацеў
Вяртацца ў роднае балота.

* * *

Вось і ты, пара ні вясны, ні лета…
Не глядзі ў раку без канца, без мэты, —
На другім баку нехта ж гэткі хмурны
Рассыпае час,
                  нібы попел з урны.
Узмахне рукой,
                  узмахне другою…
Падкажы яму,
                  як душа ізгою,
Што іскрыцца плынь,
                  нібы хвост паўлінаў,
І з выносных стром аплывае гліна,
Што глыбока — дно,
                  а жаўрук — высока,
І на ўвесь абшар не хапае вока;
Што была вясна,
                  а што будзе — спее.
І на скроні
            час
                  чысты попел сее.

* * *

Мякка ступаючы,
быцца распешчаны кот,
Заўтрашні вораг
крадзецца ў мой стомлены род.
Гразкія вочы
вяртаюцца памяць смактаць,
Слізкія рукі
бачыны пакутаў гартаць.
Грэблівым голасам
нашы замовы гнюсіць
Вораг крадзецца…
І час за свой род галасіць,
Свечку ахвярную —
маці нястомных ахвяр —
Кінуць у гідкі,
нябачны за цемраддзю твар,
Крыкам адчайным
пагнаных па свеце сірот
Мужна паклікаць
да свечкі гаротны свой род.

## ВЕЦЕР

Вечар выдасца змрочны,
Як паранены звер.
Гэта вецер паўночны
Разгайдае асвер.

І гудзе, і ляскоча,
Каб і смелы — нямеў…
«Што ты хочаш — раскошы?
Ці таго, што не меў?»

Гэтак дзьме,
                    як пытае
У пірата пірат…
«Дзе ты, вечнасць сляпая?» —
Слоўка ўставіць пагляд.

Гэты вецер забраў бы
Ўсё,
        бы ў ясеня ліст.
Ні раскошы,
                    ні праўды,
Толькі гук,
                    толькі свіст.

І няздольнасць заплакаць
Ля забытых магіл,
Толькі след ваўкалака
Праз увесь небасхіл.

## ПОМСТА

На сухое лісце ў садзе,
Не кранутае расою,
Нехта стомлены прысядзе,
Абяздолены красою,

Непрытульнаю і простай,
Як падгрэбенае лісце,
Са сваёй пагбанай помстай,
Што шукае ў свеце выйсця.

Помстай карнай
і няздатнай
На пагрозлівую мэту,
Белым светам — неаплатнай,
Непадатліваю — свету.

З помстай,
чуйнай да прынукі,
Што жыццё падаравала:
Выпраўляючы на мукі,
Жыць —
як помсціць —
выпраўляла

За сваю скупую веру,
За свае малыя крылы…
Нехта сядзе
і сякеру
Кіне ў лісце,
бы ў магілу.

## ТОЙ, У МАГЕРЦЫ

Ізноў смяялася люстэрка
У пачакальні для смяротных.

І толькі светлая магерка
Схавала чыйсьці твар гаротны.

А ўсе астатнія крычалі,
Махалі гнеўна кулакамі,
На сценах даты пазначалі
Крыві ўцвярдзелай камякамі.

А ён мітрэнгі стараніўся,
Як хворы —
лішняе цукеркі,
Той,
што магеркай бараніўся
Ад непрасветлага люстэрка.

Чым даражылі —
адракліся,
І першы ўпаў,
хто дужа пяўся…
І калі ўсе яны змагліся, —
То ён нарэшце засмяяўся.

* * *

А словы курчацца і круцяцца,
Як хвост скалечанае яшчаркі,
Да непрызнання не прывучаны,
Нібы распешчаныя падчаркі.

Непаслухмяныя і марныя,
Як тое вогнішча патухлае,

Нібы спакусніцы базарныя,
Крычаць,
                    але ніхто не слухае.

Дзяруцца, бедныя, на моўніцы,
Не грэбуюць гнілымі сцэнамі
І падаюць, як заваёўнікі,
Перад спакуснай Трої сценамі.

Але не ўбачаць,
                                хоць і хочацца,
Вачамі, змалку завінутымі,
Што ўсё сапраўднае прарочыцца
Іх прыжыццёвымі пакутамі.

* * *

Калясьмі праехалі па крозах.
І прысыпаў раны горкі пыл.
Сівізны задумлівая проза
Ахінула цёмны небасхіл.

Калацілі сутаргі бясплотны
Нечаканых крозаў далягляд,
Цішыні бязважкія палотны
Прынялі
                    ў свой безнадзейны спрат.

І ніхто сляпы да іх не збочыў,
І ніхто відушчы не падняў,

Толькі ў цемры калясьмі прарочыў
Той,
        хто сваю долю даганяў.

* * *

Не, гэтак не клічуць, а просяць.
Ці толькі змаглі даравацць
За тое,
            што часта галосяць
І ўголас не могуць співаць.

Замкнёныя ў гмахі канонаў,
Дачасна закрыўшы раты,
Сягоння стаяць ля амбонаў
Нялюдскія нашы браты.

І самая цяжкая доля
Скранае скалечаны слых…
Не, гэтак не клічуць,
                                    а моляць
За тых,
            хто дачуецца іх.

* * *

Ссыльныя словы вяртаюцца,
Пуста на котлішчах дзікіх.
Скрушна прад імі пакаецца
Небам Сусвет без’языкі.

Цэркаўка з купалам воблака
Слёзна пакліча на споведзь.
Караю кшчоныя воблікі
Зноў сваё грэшнае мовяць.

Слова прыўзнімецца сцішнае,
Нібы скалелая рожа.
А даравапь усявышняе
Нават і слова не зможа.

* * *

Зноў воблакі гастрольныя
Над нашым лёсам плаваюць,
Высокія і вольныя,
Зноў вучаць грэбваць славаю.

А мы любіць прывучаны
І слаўнае, і слоўнае,
Спраўляе ў нас заручыны
З напышлівым бязмоўнае.

Чужое ды падробнае
Сапраўднаму ўсміхаецца,
А кволае і дробнае
З вялікім абдымаецца.

Салодкую з гаркаваю
Крывінкі з губ аблізвалі…
І з гэтакаю славаю
Не ведаем,
як выжылі.

## МІФ

Заходзяць міфы ў сад
Праз весніцы старыя,
Дазбірваюць апад…
Няхай іх Божа крые.

Не чуе ваўкарэз
Ні злодзея, ні птаха, —
У ціхі кут залез
Паслухаць месу Баха,

Што льецца праз вакно…
А міфы так шчыруюць —
І яблычак, відно,
Смачнейшы ўсё каштуюць.

І раяцца,
                  а як
І гэты сад аддзячыць,
Які пакінуць знак,
Пакуль ніхто не бачыць?..

Як падаліся ў лес,
Нібыта ўслед за ліхам,
То з імі — ваўкарэз,
Які зрабіўся міфам.

А ў сад ляціць куваць
Зязюля.
                  Раз — і моўкне.
І Баха не чуваць.
Апад забыты горкне.

## ЗМЕНА КВАДРЫ

Вырвуцца з рук хвіліны
і паляцяць да зор.
Здыме ліхтар прад небам
брыдкі свой капялюш.
Месяц звыкла мяняе
свой абрыс і калёр,
Быццам зноў паўтарае
постаці нашых душ.

Зменіцца квадра.
Гэта
лета пайшло на спад.
Мята з паўночы пахне,
нібы апошні раз.
Цяжка ўявіць,
што бачыш
часу свайго распад,
Думаючы пры гэтым
пра нескančоны час.

* * *

З абэцэды пракуднае долі
Не паспеем раскласці склады.
Як спружыны,
заведзены ролі,
І падзелены ролям гады.

І прынады вісяць,
як у краме
Бранзалеты для гожай рукі.
Адштурхнуўшы збавенне плячамі,
Мы спяшаем да іх напрасткі.

І паверыўшы ў звычкі і веды,
Азірнуцца не можам дарма, —
Рассыпаецца сэнс абэцэды,
І збіраць яго — сэнсу няма.

## ХВІЛІНЫ

Зноў пратупаюць хвіліны
Па прастуджаных масніцах,
Ад часінаў боскай гліны
Ані могуць прыпыніцца.

Не адвернешся ад гукаў,
Сэрца б'ецца ў іхнім рытме,
Падасі вітальна рукі —
Правядзеш па вострай брытве.

Ні развага, ні замова
Не астудзяць ад экстазу.
У сугон прамовіш слова,
Не чакаючы адказу,

І не ўчуеш адгалоску,
Што папхне няўзнак у спіну —
Ад тае часіны боскай
Да апошняе хвіліны.

* * *

Хоць аднаві даўнейшы тракт —
І на вазок, і стрымгалоў
Паўз той разбураны вятрак,
Што нашы дні перамалоў.

Але яму ўжо ўсё адно,
Чаго, куды ты і адкуль,
Хоць падпалі сваё майно
І растрасі ягоны культ.

Хоць свет дазвання перайнач…
Ды, зрэшты,
                    як сцвярджаеш ты, —
Харон бліжэй,
                    чым той аснач,
Што па Дзвіне сплаўляў плыты.

* * *

Высах вецер у разлогах,
Вечар вочы атуліў,
Дзікі голас звера злога
Змрок прынёс у хатулі.

Адпусціў на волю голас,
Прыхаваны, як знарок, —
Тонкі-тонкі, быццам волас,
І пранікліві, бы зрок.

Перапэцканы імглою,
Падбухторваў —
як нам жыць
Паміж небам і зямлёю,
Не зважаючы мяжы.

Можа, вымерлі б ад страху
Мы, хто цемры не хацеў,
Каб не ціхі голас птаха,
Што з-за свету прыляцеў.

* * *

Дзень як дзень.
Ды цямнець
Пачынаюць прылескі.
Сонца будняга медзь
Сыдзе ў вечара фрэскі.

Парушынкі святла
На нябёсах асядуць.
Паглядзіць з-пад крыла
Птушка з роднага саду

На сівы небасхіл
І зацэплены месяц…
Горкі ў цемрадзі пыл
Цені вечныя месяць.

І дарога да воч,
Як лязом, дакранецца —
Бы апошняя ноч
Для жыцця застаецца.

* * *

Вось і гэтая ноч-вераломніца
Пакідае на ранні сумнівы.
Сняцца сны.
                    Ды не кожны запомніцца,
А запомны —
                    не кожны шчаслівы.

Гляне дзень праз акенца прымглёнае
На скамечаны высненым ложак…
Ды шчаслівае
                    толькі саснёнае,
А забытае —
                    спраўдзіцца можа.

## ФАКСТРОТ ПЕРАСЦЯРОГІ

Пусцее пагляд,
                    нібыта аб’еўся мудранкаю.
Нямее язык,
                    бы ў кіпені толькі што быў.

Жывы далягляд
                    завесім ад слёз выцінанкаю —
І зробімся тым,
                            да чаго прывучылі рабы,

Высокай маралі
                             і зломаных душаў ахоўнікі,
Прапітыя ў карты,
                               і служкі магічнага «я»…
На «я» пачынаюцца
                                   самыя брыдкія слоўнікі,
З «я» — хворы народ.
                                        Але напачатку —
                                                              сям’я,

Што любіць глядзець,
                 як муштруецца з зоркамі месячык,
Бы ўчора,
                   і гэтак,
                    як прашчур калісьці глядзеў…
Ды толькі не бачаць людзей
                      паміж зор
                             ні вяскоўцы,
                                        ні месцічы,
Бы нехта бяльмо
                    на іх вольныя вочы надзеў.

Вось так і жывём.
                      І не вабіць айчынная талія,
На п’яных плюём,
                          як на звыкла павалены плот.

І думкі няма,
                    што напраўду чакае Ардалія,
І кружым па свеце,
                    бы танчым апошні факстрот.

## ЛЮСТЭРКА

Люстэрка маніць.
                              Што люстэрку —
Як за душою не стае.
Якая ў свеце паняверка! —
Ды нельга свету без яе.

Скразною ніткаю нязгоды
Паміж вялікім і малым
Перакрыжована прырода.
А мы ўзіраемся-глядзім,

Каб пра сябе як больш дазнацца
І потым як зручней пачаць
За самым важкім выпінацца,
А ўсё астатняе таптаць.

І выхваляцца перад светам
Тым,
        што ў сваім нясеш гарбе.
Люстэрка ж зманіць.
                              Ды за гэтым
Калісьці ўбачыш сам сябе.

* * *

Анёлы ляталі знарок
Над целам і змораным духам;
Скупы, як на свірне замок,
Выгнаннік нашэптваў на вуха

Якоесь чужое слаўко,
Паднятае ім на скрыжалях;
Схадзіўшы паўсвету,
                    нямко
Узважваў прыварак на шалях;

Ржавела майно ў цішыні,
Сабранае вольнаму Спасу;
Наўкол пашчапаныя пні
Стаялі,
        як помнікі часу.

А сонца вячорнага медзь
Свайго не мяняла калёру…
І трэба ісці ды паспець
За краты няблізкага бору.

## БУБНАЧ

Эх, бубнач, бубнач,
                    ты каго вярэдзіш?
Сыпану ў магерку поўнай жменяй медзі.
Леваруч — скрыпаль,
                    праваруч — дударык,

Паміж намі час —
не стары, паўстарак.
Дык скажы, бубнач, як твае заробкі,
Пыл якіх дарог на твае атопкі
Цяжкай ношай лёг?
Да зямлі прыкуты
Праз чыю душу і чые пакуты?
Ты маўчыш ізноў, быццам рыба ў тонях,
Толькі «бух» ды «бух» —
у самлелых скронях.
Хоць вучы цябе:
«аз» ды «букі», «ведзі»…
Толькі слёзы там, дзе насыпаў медзі.

* * *

Сустрэчны вецер абхапіў сілом.
Яшчэ не ўсё былое стала тлом.
Што ажывіў —
не ўсё яшчэ жывое.
Дзе аджываем,
дзе заўжды жывём?
У словах знаўцы
ці ў вачах ізгоя?..

А вецер, вецер…
Слова — не браня.

Шукаеш там,

                    дзе нельга анідня.

Перабывае ля душы паўсвету.

Сляпы напой —

                        настой на каранях —

Абмые лёс,

                  але забрудзіць мэту.

А сціхне вецер —

                          і свае правы

Спаткаеш пасярод сухой травы.

І далягляд

                 твой пот і бруд спаткае…

Нібы ажыў

                 і з тла прыйшоў жывы —

І толькі ветру ў грудзі не хапае.

* * *

Блішчыць ставок, нібы чало.
Вясло прытулена да лодкі.
Не прыпыніла, што магло,
Пачуццяў ранняе паводкі.

Каля русалчынай вярбы
Шукаюць рызыкі цвярозай
Пачуццяў верныя рабы —
Юначы шал і сталы розум.

Сарвалі воблакі з арбіт
І п’юць, нібы напой любовы.
Вады суцэльны маналіт
Расколе іх пагляд вярбовы,

І патрывожанае дно
Чало, як лодку, перакуліць.
Як на замежнае кіно,
Збягуцца людцы з блізкіх вуліц.

Ды зрокам змушаных вачэй
Не ўбачаць ранняе паводкі,
І толькі позірк апячэ
Сухое дно забытай лодкі.

* * *

Зноў выпаў снег.
Па цаліку
Яшчэ ніхто не вывеў след.
Яліне лёгкую руку
Цалуе дуб —
стары эстэт.

Умерзлы ў сон,
заснуў паром,
Бы ўсё на свеце перавёз,
Спазнаўся з крыўдай і дабром
І вывез соль астатніх слёз.

З палёгкай вернага слугі
Заснуў,
дазнаўшыся ў вясла,
Што паяднаны берагі,
Якія вечнасць развяла.

## СТАРАСЦЬ. МАТЫЎ

Старое паліто
пакінута для молі.
Заходзіцца душа
ад паху каніфолі.
Крывога павука
скалечаная пража…
На што яшчэ
рука
дрыготкая пакажа?
На тоненькі альбом,
дзе сцішаныя пары,
Каханкі ды сябры…
І твары, твары, твары…
Усё ў сваю пару,
усё ў забытай ролі.
Юнацтва паліто
пакінута для молі.
Счарнелае
ў кутку
сумуе піяніна,
А ў ім адзін матыў —
што йграла Празерпіна.

## ДОЖДЖ

Дождж.
          І няма ад яго абярогі.
Што наказаць яму, чым адмаліць:
Песняй гаротніцы, крыўдай нябогі,
Прахам пакутным сваім атуліць?

Шэраю, шэраю,
                    млоснаю глінай,
Перадрыжалага дрэва лісцём?
Перад сабой,
                    як прад даўняй правінай,
Стаць на калені і кленчыць жыццём?

Золка маўчаць,
                    як знямелая рыба,
Покуль не збераш свой выстылы прах,
Покуль не выгарацць кроплі на шыбах,
Як спавядальныя слёзы ў вачах?

## ЗМЯРКАННЕ

Як смык, парвецца вецер
І стане цішынёю.
І проста будзе ў свеце —
Як за глухой бранёю.

Прыкутыя да руху,
Праз лёс імчаць вагоны,

Расце цяжар у вуху,
Як камень — сын Гаргоны.

А ў небе Дзень Чацвёрты
Свой доўгі век прадбачыць
І для жывых і мёртвых
Абвесціць час сабачы.

І вызнаны, здаецца,
Драбніцы, кроплі, кропкі,
І толькі застаецца
Спазнаць свой век кароткі.

## НА ЎЗГОРКУ

Дзве хаткі на ўзгорку,
як птушкі на голым кусце,
Дзе сцежка
жарству абняла і траву нарадзіла,
Штоноч мандрагора
са стогнам ля вокнаў расце,
Са студні туман выплывае,
як думнасць з кадзіла.

Дзве хаткі на ўзгорку
жаўрук-бесхацінец гукне,
Надоўга запомніць
свой голас бяскрылы не зможа,

І памяць
бязважкай смалою
збяжыць па сцяне
І пахам жывым
пусты напалохае ложак.

Дзве хаткі на ўзгорку.
Між іх толькі два правады —
У дзікім тумане
спрадвечнае лучнасці нервы.
І хто ні прыходзіць —
ніколі не дойдзе сюды,
У час пракаветны,
як светлая мудрасць Мінервы.

## ВОГНІК

Мароз.
Парыпваюць масніцы.
Да вокнаў цені прымярзаюць.
У небе ясняцца зарніцы
І зоркі крыжыкамі ззяюць.

І ветах плішчыцца сляпіцай
На пасівелы ліст альясу…
У печы вогніку не спіцца,
Бы ў ціхім горадзе паяцу.

Вачамі хлопчыка малога
Каштуе цемру, як прынаду.

І прыпыняецца дарога,
Не перастрэўшы далягляду.

А вогнік зоркі выдзімае —
Даўно пагубленыя згадкі.
І ўсё прытомнае скідае
Свае намерзлыя апраткі.

І прасвятленне, як спатоля,
Падкажа звыклым запаветам,
Што рызыкоўна зведаць болей,
Чым даравана белым светам.

* * *

Ачужэла душа з адзіноты,
Ацалела,
                    бы ў снах мезазой,
На прыстойна-смяротнае «хто ты?»
Зноў адмоўчыць сівою слязой,

У якой неабудныя страсці
Не прыснежыла нават зіма,
А калі ж у душы яе ўкрасці, —
Стане, мабыць, душою сама.

## НАСТРОІ

### 1

Галінка ў шклянцы са слязамі
На згоне сівернай зімы.
Па хаце скрыпне палазамі
Пагляд адчайны і нямы.

Азоў халодныя старонкі
Гартае вецер на стале.
І медны голас са скарбонкі
Скупыя словы небу шле.

А лыжка тонка адзавецца
На хворы кашаль вераб'я.
І ў рукі просіцца пагрэцца
Сняжынак вольная сям'я.

### 2

У чайніку журчыць ручай,
І кропля ліжа падваконне.
Прабіўся з церняў малачай
У нечаканае сягоння.

Шпаку дарогі не відно
За незамглёным небакраем.
І паглыбелай студні дно
Крупінкі золата збірае.

А бэзу светлыя кусты
На сонца вочкі натапыраць…
І хто апошні, як не ты,
Чакаеш свой высокі вырай.

3

Скідае воблака кашулю
І ў люстра возера глядзіць.
Малое строгую матулю
Па-свойму вучыць свет любіць.

Са сшыткаў літары пабеглі,
Што ў думках муліла,
                        шукаць.
Безабаронныя, як кеглі,
У вечнасць знічкі паляцяць.

Асветліць золку мроі лотаць.
І цэлы век, як назнарок,
Ля самай скроні будзе лётаць
Душы няўлоўны матылёк.

4

Вакно завешана ад суму.
Да казкі гном стаіць спіной.
Надакучае кроіць думу
Лупатай ляльцы завадной.

Далонь ружовы яблык грэе,
Як слава сэрца каралю.

А цень паветранага змея
Спусціўся з неба на зямлю.

Як орды дзікія Батыя,
Дажджы ўварвуцца ў чуйны слых.
І ноч пагоны залатыя
Зрывае з клёнаў маладых.

## КАХАННЕ

Пачуцці выпараюцца,
Як фарбы з даўняй краскі.
І кінешся параіцца
Адно хіба да казкі.

Якою гэта хітрасцю
Вярнуць яго адценні?
Ці выклясці,
                ці вытрасці
З Сусвету,
                як з кішэні.

Яно ж ані пакаецца,
І дражніць, і рагоча,
І ў неба не спяшаецца,
І на зямлю не хоча.

## НА …-Я ЎГОДКІ ДЖУЛЬЕТЫ

Гэта ж зноў патухлі святлацені
І зліліся цемры кроў і плоць,
Дзве малітвы ўпалі на калені,
Дзве душы пасталі насупроць.

І ніхто іх споведзь не парушыў,
Цэрберы згубілі іхні след…
Колькі ж будуць выраджацца душы,
Колькі ж будзе нараджацца свет?!

Перад імі свет — пад неба лёхі…
Не прасіць, не плакаць, не ўздыхаць,
Ачышчаць сыходзяцца эпохі,
Так і не стаміўшыся кахаць.

## КНІГА

Насміхаюцца, рагочуць, як інтрыгі,
Хмары-воблакі і вецер неўпрашоны
Са старонак казытлівай гэтай кнігі,
Што хавае патаемныя пісьмёны.

Пані пекная саткала нітку змовы
І сюжэтную нітуе безгустоўнасць.
Яе цела сексуальныя асновы —
Абуральная падманлівая ўмоўнасць.

Так хвалююць,
                    пераводзяць нервы грудзі,
Ружа чорная на белым расцвітае…
Ды ўяўленне,
                    да чаго ж яно марудзіць,
Непрыстойнасці сабе не дазваляе.

## ПАЧУЦЦІ

Дзеці страсці, дзеці прагі
Паляцелі з нашых крылаў,
Карані шалёнай брагі
Павымалі з цёмных жылаў.

Самагубцы, самазванцы,
Абсвістаныя прамоўцы,
Непрытульныя, як танцы
На прыцёмненай пляцоўцы.

Важакі слухмянай зграі
І выгнання ваўкалакі,
Дзеці пекла, дзеці раю —
Часу горкія прысмакі.

Анішчымленыя снамі,
Не мінулі пакарання —
Быць заўсёды побач з намі
Ад узлёту да скanання.

## ВАРАЖБА

Ляціць пчала з Венерынай рукі.
Над галавою
промні жнуць
крукі.

І хтось варожыць
за бліскучай шыбай
За два
з мукі свянцонай
праснакі,
І слоў не кажа —
нібы рыба з рыбай.

І не зважае,
што пчала зумчыць,
Што крук усеўся
промні малаціць,
А праснакі
пацук аднёс у спраты…
А чым яшчэ
за праўду заплаціць,
Каб толькі ўчуць,
што ў нечым вінаваты.

* * *

Сцямнела.
                    А пах багуну —
Бы свет нараджаецца знову.
І зорка паспела міргнуць
Яшчэ непачатаму слову.

І што ні пачуеш,
                                  абы
Пад ночы даверлівай струны
Спяваць пачыналі рабы,
А троны пакладіся ў труны.



# Хоць і ноч, ды мая

* * *

Як на баль,
                    апрануся дыхтоўна,
У парык агарну я свой плеш,
Выйду ў свет —
                        зіхаткую катоўню,
Праз якую прайсці не мінеш.

Там свой гонар нясуць
                                кавалеры
Годных ордэнаў,
                        выспелых дам
Ў апляваныя золатам дзверы,
У прэстыжны ўвабраўшыся крам.

Там зыкуюць штодзень фантазёры —
Пазбіраныя разам сляпні,
Пагубляныя ноты з мажору
Падбіраюць старыя, як пні.

Там падзелены ролі і ролькі
І пад густ,
                  і як хочаш — на смак…
Вось і я выбіраюся,
                            толькі
Зашпілю свой карослівы фрак.

* * *

Вінаваты за тое,
што ёсць —
Пракаветны,
прыгледзішся — цнотны,
І прыгонны,
і белая косць,
Караністы,
а ўсё ж — пералётны.

Гаспадарыў,
а чуўся, як госць,
Закаваны,
а ўмошчваў за краты…
Вінаваты за тое,
што ёсць,
І за тое,
што быў,
вінаваты.

* * *

Вось і крэўнікі на дварэ,
Столькі іх —
не відаць небакраю.
Гэта ўсе,
хто са мной памрэ,
А пакуль — як без іх, — адміраю.

Баба Вера і дзед Васіль…
Не, не буду стамляць імёны.
Прычашчонага хлеба скрыль
Асвятляе мае пісьмёны.

Не пытаюцца: «Як жывеш?..»
Так пытаюцца ў тых,
хто вечны.
І не купіш,
і не прап’еш
Нашай крэўнасці Голас Млечны.

Неадольнае душ зліццё —
Сугалоссе сустрэчы гэтай —
Узнімае мяне над светам
І нясе праз усё жыццё.

## СТАРЫ ДЗЯДЗІНЕЦ

Гіпнатычныя нашы дзядзінцы,
Дзе расце неадольны палын,
Не раздам крумкачам на гасцінцы,
Не аддам за багаты калым.

На далонях сівых папялішчаў
Прыпыню непрытульны пагляд.
З поля вецер назойлівы свішча,
З хмары падае выкляты град.

Ля душы адзінокая груша
Выкрасае лістотай святло

На мяне,
　　　　　што гармонію зрушыў,
Памяняўшы Сусвет на жытло.

А малы каласок адзічэлы,
Што любая нягода сагне,
Настаўбурвае вусы, бы стрэлы,
І, як вой, сустракае мяне.

* * *

Як не сатлець ад боязі прызнацца,
Што блазнаваць прывучаны здавён
Перад людзьмі з аплёванага пляца,
Сярод прароцтваў,
　　　　　　　　што ўвайшлі ў закон,

Які на веру касавурыць вока,
Які на праўду помсліва сіпіць…
Яшчэ мой гнеў
　　　　　　у недрах слоў глыбока
На немаўлячай шчырасці кіпіць.

Пякельна так,
　　　　　　як на душы ў асілка,
Які дазнаўся, дзе лютуе Цмок,
Пакуль жыццё —
　　　　　　　　адзіная памылка,
Крыштальным злом абстаўлены куток.

* * *

Шукай, мой цэрбер, не драмі,
Мяне, як самы слынны клад.
Калі ты ў небе,
я з людзьмі,
Калі я — цвет,
то ты — апад.

Як ні кляні і ні суроч,
Мяняй хоць колькі хочаш вер, —
Калі ты — дзень,
тады я — ноч,
Як ты — анёл,
тады я — звер.

Не адставай, мой страхапуд,
Я без цябе — зусім не я.
Як ты — падсудны,
я — прысуд,
Калі ты — жыта,
я — жняя.

Калі ж ты — бераг,
я — прыбой,
Ты — пад зямлёй,
я — на крыжы…
Вось-вось я стану сам сабой.
Чаму ж ад страху ты дрыжыш?!

## РУКІ

Прымусілі задумацца грахі.
Перасціхае годнасць без прынукі.
І дождж ліецца посны і сухі
На светлы твар і выцвілыя рукі.

Я ўсё даверыў ім, сваім рукам, —
Паліць агонь і паланіць жаданні…
За драбязу свой хісткі трон аддам,
Грахі прызнаю на святым дазнанні.

І басаנож пайду ў свае лугі,
На новы круг пякельнасці і мукі,
Пакуль душу сціскаюць ланцугі,
Што адкавалі выжытыя рукі.

* * *

Пытанні, як абразы,
Наявяцца ўначы.
І ў невараць адказы
Сплаўляюць асначы.

Нянаскія рапсоды
Спяваюць пры вакне,
Класічныя народы
Даквольваюць мяне.

Што ні адкажаш — марна;
Вядзе сваё рапсод:

Што быцця ў сабакарні
І я,
    і мой народ.

Зашыўшыся ў закутак,
Замольваю грахі,
Да немачы — прыкуты,
Да вечнасці — глухі.

І нараджаюць мукі
На ўсё адзін адказ:
Што не прамовіш «букі»,
Не праказаўшы «аз».

* * *

Над вадой тырчаць
                        надмагіллі-палі.
Ці жыве тут хто,
                    дзе мяне чакалі?
Пагляджу ў ваду —
                        ні крыві, ні плоці,
Невыразны твар
                    паўстае напроці.
Запаўзе слімак
                    на мае маршчыны,
Толькі слоў маіх
                    не бубняць мужчыны.
А на мне рыззё,
                    прада мной — Айчына,
Толькі слоў маіх
                    не пяюць жанчыны.

## НА СТРОМЕ

Стромы бераг.
Асцярога
Узнімаецца на схіл.
Набліжаюся да Бога,
Уцякаю ад магіл.

Ды ніяк не зразумею,
Колькі клёку ні прымей:
Зверху глянеш —
там пігмеі,
Глянуць знізу —
я пігмей.

І ўзіраешся наўкола:
Дзе ён,
той дзяржаўны рай?
Пелі нам садок і школа:
«Каравай, каравай…»

Праз гадзіны ці праз хвілі
Выкшталцоны суччы сын
З рэчкі вынырне,
як Скілій
З дарэформенных глыбінь.

«Хто там, — скажа, — ўгору пнецца?
Вы паслухайце мяне,
Ваша, — крыкне, — людцы, месца
Не на строме,
а на дне».

Тут ці лайся,
ці не лайся, —
Выбірай з двух розных «ці»:
Ці ты ўніз хутчэй куляйся,
Ці да Бога паляці.

## ЗВАНЕЦ

Абзываюся мовай лугоў,
Тонкім голасам,
як павуцінай,
Што напята між позніх стагоў
За апошняй вясковай хацінай.

Абзываюся.
Слухаю.
Спіць
Неабуднае рэха званцова.
За скупое жыццё не купіць
Мне ягонае простае слова.

Аклікаю.
Маўчанню яго
Не змагу аніколі скарыцца, —
Гэтак можна не мову лугоў,
Чалавечую мову забыцца.

## ЧАЛАВЕЧЫНА

Кіслым пахам рабарбару
Аддае мая кроў,
І жыву —
                    як хабар бяру
З абабраных сяброў.

Не хрышчоны, не ўпомнены
У казаннях святых,
Чышчу брудныя помнікі,
Сам бруднейшы ад іх.

І былым не асвечаны,
Я жыву як на здзек,
Я даўно —
                    чалавечына,
А не сам Чалавек.

* * *

Паслядоўнік прыблуднай ідэі
Несусветнага брацтва людзей,
Несмяротныя жахі Вандэі
Прымяраю да блізкіх падзей.

На плячо рэлігійнага брата
Апускаю з даверам руку, —
Як на зболены снег Арарата,
Што сплывае ў чужую раку.

Ён руку маю скіне нервова,
Быццам звыкся,
                  што будзе балець.
Гэтых рук — не апошняе слова.
Я яго бласлаўляю на смерць.

* * *

Зноў пяе
          гусляр майго сіроцтва —
Аднае мелодыі змагар,
Не маўчыць спаміж чужых прароцтваў,
Блатнякоў, хабарнікаў ды скнар…

Зацкаваны басам, свістам, енкам,
Затаптаны ў гразь,
                  умерзлы ў лёд,
Раздае разбэшчаным паненкам
Свой  паганскі і плебейскі пот.

Днём — хрышчоны,
                  а начою — кляты,
Абабраны да апошніх нот,
Сілаю аблытаны ў піраты, —
Каб забыў на свой паганскі род,

Раздае пірацкую здабычу —
Родны голас,
             памяць — на званы…
Як яго зайздроснікі ні клічуць, —
Не пачуюць ад яго маны.

Як яго ні бэсцяць,
ні катуюць,
Зрэшты — не даюць пайсці на смерць, —
Пра сябе ні гуку не пачуюць,
Так і не здалеўшы зразумець.

## СПАКУСА

Напрыканцы дарогі да спакусы,
Падняўшы вочы на высокі гмах,
Стаю не я,
стаіць юнак бязвусы
З маёй
скупою ўсмешкай
на губах.

І так заклята ён глядзіць угору,
Ажно расце —
пад самы-самы дах, —
Ані падлеглы ён чужому гору,
Не навучоны,
што такое страх.

А там, уверсе,
полымем гарачым
Хтось па вачах парыўных паласне.
І знікне гмах.
Адно ў вачах бядачых
Наўмысны цень спакусы прамільгне.

І неадольнасць зноў загаспадарыць,
Дзе звабны шлях
і хмарка над ракой…
А ў чыстым полі —
непрыкметны старац
З працягнутай
у белы свет
рукой.

* * *

Лясное возера.
Блакіт.
Шукаюць верхаводкі
Паміж пахіленых ракіт
След затанулай лодкі.

Сарве лабелію пагляд,
Як вопратку з наяды.
Ды не вяртаюцца назад
Такія вось пагляды.

Не паўтараецца краса…
Ды не сціхае драма,
Дзе свой закон у карася
І ў шчупака — таксама.

Душа спяшаецца праз жаль
З трывогаю адною,
Што я і сам стаю, як таль,
Прад гэтай глыбінёю.

І дзьме ў спіну маю свяжак,
Хоць сонца — за спіною.
І невядома,
дзе мяжа
Паміж жыццём і мною.

## ПРЫСАК

Крык у горле,
атухні, пагасні.
Я на прысак аціхлы гляджу:
Вугалькіператлелыя ясніць
Нечаканая кропля дажджу.

А над прыскам чутны перазвоны
Ацалелага ў цемры святла.
Непрытульнасці дзікія совы
Пазбягаліся грэцца ля тла.

І чаму так пякельна,
не знаю:
Кроў гарачая кратае скронь
Ці спакойная мудрасць зямная
Саграває мудрэй за агонь.

* * *

Мяняю час на попел
Трывалай сівізны.

На мне, як у раскопе,
Пласты гадоў відны.

Сляды былой адвагі —
Напластаванняў жар —
Не вымеце развагі
Казённы камінар.

Таго камінара я
І сёння прагаю.
Мой лёс перагарае
У шчэлепах агню.

І вочы не заплюшчыш,
Пакуль гарыць агонь,
На попел невідушчы,
Што падае на скронь.

* * *

Пры святле адзінокай здагадкі
Паспрабую па кроплі спазнаць,
Дзе няшчырасць,
                              дзе цёмныя звадкі,
Ці папраўдзе —
                              і словы баляць.

Не сказалі,
                    не кажуць,
                                        не будуць,
Не дазволяць сябе спавядаць,

Даравалі нястомнаму Юду…
А ці можна сабе даравацць?

Толькі ёсць —
                              што апошняе слова,
На якое злы дух блаславіў,
На яго пазлацаных аковах
І маёй не хапае крыві.

## АХВЯРА

Не хочацца ахвяр,
Ды, як прыгон, змушае
Прыліпчывы штукар —
Падробны смех Капшая.

Чым валадаў,
                    нясу
На гвалт яго кашчавы, —
Юрлівую красу
І нораў злога Кавы.

Зірнуць на ўсё крадком
Пустых вачніцаў гала,
Задзірлівы, як гром,
Ён зарагоча: «Мала!»

І выграбе з душы
Сваім акрутным «мала»

Апошнія грашы,
Што памяць прыхавала.

Ды кінецца ўцякаць,
Бы скупердзяй з базару,
Забыўшыся забраць
Мяне —
сваю ахвяру.

## НАЧНАЯ РАКА

Чарнейшае за чорнае
Прысуха ноч была.
Асіплаю валторнаю
Рака ля ног сапла.

Навяглымі баскакамі
Сіпелі чараты.
І хвалі сонна плакалі,
Штурхаючы плыты.

І не пытаўся метрыкі
У лёгкай хвалі плыт.
А таямнічы свет ракі
Чытаў начы санскрыт.

А берагі намоклыя
Распытвалі аер,
Якія гэта модлы я
Згадаў з забытых вер;

І што гэта за крэскі я
Пакінуў на пяску,
Чыё жыццё біблейскае
Вісіць на валаску.

## СОН

Дзверы заснулі.
                    І можна спачыць,
Выйсці з атлумленых скроняў.
Светлую птушку пачуць на плячы,
Птушку з завоблачных гоняў.

Моўніцы сціхлі ў крыві,
                              а ў вачох
Лёгкае пёрка лятае…
Толькі цяпер незапамятны Бог
Месца ў душы адшукае.

З рызыкай чуйнай святло патушу,
Каб ад былога — ні знаку.
Мернай ступою абыдзе душу
Бог у паношаным фраку.

Не прыпыніўшыся,
                         будзе хадзіць,
Як па сваім валаданні…
А прачынаюся —
                         побач сядзіць
Птушка ў гаротным убранні.

* * *

Колькі раз прачынаюся
Ад прышэсця Хрыстовага,
Бы душой выпраўляюся
Ад старога да новага.

Ды нішто не вылечвае
Да карысці пахілае —
Ні запомнае вечнае,
Ні забытае згнілае.

Азірнуся на крыласе,
Ці адчуў хто бязбожнае:
Што прышэсце прыснілася,
Што яно — не апошняе.

* * *

Атуляюць збыткоўныя крозы,
Без якіх — ні пamрокі, ні дня.
Трон іх будні — гарушчыя слёзы,
На якія вачэй не падняў.

Касталомы яны і зняверцы…
Слёзы тыя працягваю ліць —
Спіс падказак на бруднай паперцы,
Па якіх забаронена жыць.

Бач, заступнікі,
бач, і дарадцы…

І цягну іх, як мех арахоў,
А калісь прыпаўзаў заляцацца
З пляшкай лёсу,
вязанкай грахоў.

І ля трона ляжаў у знямозе,
Як анёл на святых абразах…
Напльваюць збыткоўныя крозы —
І святая ліецца сляза.

## КАПЛІЦА

Па старым намоклым парку
Ходзім —
я
і засцярога
Ад пустой з душою сваркі:
Ці чакаць сягоння Бога?

Не падкажа і капліца,
Толькі мовіць,
што не шкодзіць
Нам на осліка маліцца,
Што Хрыста па свеце возіць.

Ослік?
Богу ці пасуе?
Але я паверыць мушу.
Хто паверыць,
той пачуе:
Капыткі «цок-цок» паўз душы.

## ПЕРШЫ СНЕГ

Белыя стромы стрэх.
Вызнаны шлях праз гоні.
Самы элітны снег
Падае на далоні.

Падае прада мной
І растае,
                    як цнота.
Казак,
                што чуў даўно,
Не перачытваў потым.

Падае,
                быццам лёс,
Што нечаканы самы…
Ды ягоных нябёс
Не дастанеш вачамі.

* * *

Самоты краскаю гаркаваю
Кранецца скроні чысціня.
А гэта ж я над светам плаваю,
Мінаю кветнік і вішняк

Над непагодліваю плютаю.
Зусім забыўшыся на скон,
Я над людскім здзіўленнем лютую,
Як нескланяны людствам склон.

Ды, бы знямоглы, раптам падаю
Ў чыюсьці мяккую далонь.
І нейчы дух самотны радую,
Што і ў мяне ўдыхнуў агонь.

* * *

У святлаценях дрэў намоклых
Шукае цень задумны птах.
А я свае скупыя модлы
Вязу на ўпорчывых валах.
За мною цень —
як меч Дамоклаў
У запрыгоненых руках.

Рыпяць, як змоўнікі, атосы,
Злуюць дарогу і валоў.
І мой сумніў,
як хлопчык босы,
Глядзіць у вочы,
быццам просіць
Вярнуцца ў цёплае жытло.

А цемра высмакча вачніцы.
Ды ўчую —
цень за мной баліць.
Я буду ценем бараніцца,
Каб да якой,
але бажніцы
Свае жаданні прытуліць.

* * *

Помню,
              месяц свяціў сярод дня,
Пазіраючы долу нясмела.
Ў развіхуранай грыве каня
Пералётная птушка ляцела.

І на крохкай мяжы небыцця,
На памежку прыгнёту і волі
Сабірала сляпое дзіця
Пазбіваныя краскі юдолі.

І праз голас сівой даўніны
Прабіваліся гукі скупыя —
Спавівала дзіцячыя сны
Шматпакутная Дзева Марыя.

## СТАРЦЫ

Прыходзілі старцы,
                              чакалі свайго праснака,
Кавенькамі грукалі,
                              літасць маю выклікалі,
Распятыя словы
                         здымалі з майго языка,
У кайстры хавалі.
                    І кайстры трымцелі, як шалі.

Стаялі ў парозе,
                         заспеўшы мой свет між азоў,

Кавенькамі грукалі,
                                        тлум ад мяне праганялі…
Заходзілі старцы,
                                        як светлыя сны з абразоў,
Якія
          даўно
                    мае цёмныя ночы міналі.

## ВЯРГІНІ

Над садам лятаюць вяргіні,
Выводзяць пад небам кругі.
Няўжо нараджаюць багіні,
Няўжо паміраюць багі?

Хоць цемру на вочы навесьце, —
Я буду дзівіцца да слёз,
Якое па ліку прышэсце
Ўзняло іх да самых нябёс.

Не знойдуць і там яны —
                                        раю.
Ды выкрые іхні імпэт,
Як догмы ў душы адміраюць
І крэўны вяртаецца свет.

## ГОЛАС

Поўная попелка тлуму.
Слова на дым выстые.
Хвілю расцягваць,
                    як гуму,
Волі маёй не стае,

Покуль замоўніцкі голас,
Што нарадзіўся ў слязе,
Не зварухнецца,
                    як полаз,
І на шчаку не спаўзе;

І да самой аблачыны
Выслізне з крыку майго…
Рукі падымуць маршчыны
І перахрысцяць яго.

* * *

Нібы струна аслаблая,
Фальшывіць ручаіна.
Не вецер —
                    воля д’ябла ва
Штурхае нас у спіны.

Не пералічыш воблакаў,
Як спынішся на ўзлессі,

Нібыта нас там вол чакаў,
Каб нашы скарбы везці.

А ношы той — паўкіпціка,
Душы — адна астача,
Апошняя энцыкліка,
Якую лёс мастачыў.

І, як даўней,
                        не ведаю —
Ці ёй адной маліцца,
Ці зноў
                над абэцэдаю
Свайго жыцця схіліцца.

* * *

Кроў,
        ты наклічаш такія прыгоды, —
Цяжка ўмасціць іх на долі крыжы.
Іх ані зрушаць жаданняў падводы:
Лопнуць пастромкі,
                                парвуцца гужы.

Кроў,
        ты напомніш пра час неаднойчы
Пнём — пад нагамі,
                                дымком — уваччу…
Я да цябе,
                як калючы ядлоўчык,
Прыскам душы прыхінуцца хачу:

Слухаць,
як блудзяць па мне тваe токі,
Нібы русалчыны дзеці ў трысці,
І да апошняй расстайнай валокі
Разам нялёгкую ношу нясці.

## ТЫРАН

Я — тыран.
Даўно апеты
Мой такі класічны гнеў.
Трыумфальныя паэты
Выціраюць ногі мне.

Я ж не выстар,
мне ахвота
Кожнай ночы пешчы піць,
Мне падносяць мёд да рота
Столькі гойных маладзіц.

Я не брыдкі, не падслепы,
Ні на волас не сівы.
Кожны дзень сыходжу ў склепы
Выпіць свежае крыві.

Чым яшчэ свой гнеў засведчыць —
Хоць нязначным, хоць малым, —
Мне ніхто не запярэчыць,
Значыць, я патрэбны ўсім.

І ніхто, бы я, не можа
Лускаць славу, як арэх…
Я — тыран.
                    І гэта, можа,
Мой адзіны крэўны грэх.

* * *

Голас мой каталі
Паслухмянасць і згода,
І свой страх выдавалі
За жаданне народа.

Выкшталцоныя знаўцы
Хцівых «нельга» і «можа»,
Лепшых думак крываўцы,
А спазнаў я вас —
                                позна.

Бо ці здолею ўкленчыць
Да святынь, што цураўся.
Паламаны парэнчы,
За якія трымаўся.

* * *

Асцярожна, калі падыду,
Прыхавайце сваю далікатнасць,
Я люблю вашы злосць і брыду
І разбэрсанай думкі плакатнасць.

Асцярожна, калі не скажу
Расцугляным пачуццям ні слова, —
Вы яшчэ не спазналі мяжу,
За якою губляецца мова.

## ДВУБОЙ

За даляглядам сціхла звяга,
Што распачаў мой сталы Бог.
Маёй юначай пыхі шпага
Даўно закінута ў быльнёг.

Дый сёння рызыкай двубою
Крывінкай кожнаю гарым,
І ён, як ёсць, — перада мною,
І я, бяззбройны, — перад ім.

І кулакоў не маем дужых,
І ў твар пляваць няма каму…
З усмешкай ён працягне ружы,
А я з ухмылкай не вазьму.

* * *

Спякота.
Постаць вудара
На плыценькай рацэ.
Пясок, як тлустая ікра,
Варушыцца ў руцэ.

Шпурнеш у млявую ваду
Іскрысты той капеж…
Вудар пракажа ў бараду
Скупое: «Ну даеш!»

Зматае вуды.
                    Спаласне
Нешанцаванне з рук.
І пазірацьме на мяне,
Як выліты блазнюк.

Сляза сарвецца з-пад павек,
Як слізкая луска,
І побач пройдзе чалавек,
Як праплыве рака.

І ўбачу я:
                    на дне вядра —
Не рыба ды вада, —
Пясок, як тлустая ікра,
Што я ў раку кідаў.

## РЫЗЫКА

Абяцаю толькі славу,
Што схавана ў крэўных спратах,
Адпускаю на забаву
Сярод бедных і багатых.

Адлучаю ад настрою,
Што прывучаны да згоды,

Прывучаю быць стралою
Выпадковае прыгоды.

Караную на нястачу
Не апошняй воляй злою…
Адракуся, калі ўбачу,
Што вярнулася былою.

* * *

Я быў сягоння рызыкантам,
Шукаў сябе, пачуўшы след,
Высочваў — вочы арыштанта,
Прыбраны ў плоць чужы шкілет.

Я запыняўся на скрыжалях,
Згубіўшы след.
А ўсе наўкол
Мяне, як блёкат, абражалі,
Плявалі ўслед, бы перасол.

Ды хто-ніхто, зусім рахманы,
Мяне пагладжваў пакрысе,
Як той балонак надзіманы,
Што хутка ветрам панясе.

І галубы, як сатэліты,
Ляталі з пыхаю наўкруг.
А на скрыжалях размаітых
Не прыпыняўся вечны рух.

* * *

Я чэрап конскі прывалок у клас,
Паклаў на стол ля кнігі ідэёвай,
Хай паскубе самлелых душ папас
І, як тлумач, заржэ забытай мовай,

Ды абзавецца голасам суддзі
Замест трацейскай класнае гадзіны…
І не блазнуй, а слухай і глядзі,
Дзяўчо глухое і сляпы хлапчына,

Як выплываюць формулы —
з вачніц —
Маны і веры, годнасці і страху
І галаву тваю схіляюць ніц
На парту,
як на выстылую плаху.

І хай яны пакуль не па гадах, —
Жыццё не скончыць выкладаць урокі…
І застануцца думаць у дзвярах
Прыціхлыя настаўніцкія крокі.

## ФАЛЬВАРАК

Блукалі цені па фальварку,
Па дапатопным ліпняку.
А неба мерны звон жняяркі
Дало перакрычаць круку.

І часу, нібы ашуканцу,
Ад сораму не ўзняць вачэй
На пах любві і памеранцу,
На рух аголеных плячэй.

На ўсё,
што льецца ўглыб і ўшыркі
І на душы мільгне няўзнак
Блішчастай засцежкай лакіркі,
Што з весніц ступіць на бальшак.

І на апошнюю фурманку,
Што ў белы свет заляскаціць…
Шукаю ценю фальварчанкі,
Але дарэмна.
Свет маўчыць.

Адно душа складае псалмы
І выпраўляе на бальшак,
Дзе нечы цень
пад звон астральны
Вымае з прахам партабак.

## ПЫЛ

Дрыжалі пальцы,
і сляза
Мой акрапіла шлях.
Дзядзькі сядзелі на вазах,
Вязлі на продаж страх.

Спяшалі —
быццам ад чарцей,
Што паднялі галас,
Ды гаманілі пра дзяцей
І пра дзяціны час.

За імі краўся свет, як пыл.
І следам я пайшоў,
Каб паглядзець,
ці хопіць жыл
І веры —
у дзядзькоў.

І па якой брыду вярсце,
Як патрапляю ў след?..
А пылу слуп расце, расце —
І засланяе свет.

## ПАКУТЫ

Я прамаўчаў, не паківаў
Нязгодна галавою,
Як нехта ў чорным наліваў
У келіх мой напою.

І так здзівіўся той сугней —
Аж рукі задрыжэлі, —
Што выпіў я —
не ап’янеў.
І зноў падсунуў келіх.

Ён так гарэў,
ён так жадаў
Пачуць мае пакуты, —
І келіх поўненькі падаў,
Падсыпаўшы цыкуты.

Я выпіў,
бы агню ўхапіў,
Цяпло пайшло па целе:
І — ані знаку — як не піў.
І зноў падсунуў келіх.

І ён пабег у дальшы склеп
Шукаць якой атруты…
А я падняўся і пайшоў,
Каб не цвяліць сваёй душой
Ягоныя пакуты.

## ГАД

Ляціць пажоўклы ліст
Дамоклавай слязінай.
Як сумны арганіст, —
У памяці адзіны.

З расстайных тых лістоў,
Што вера адпісала:
Маўляў, сваіх братоў
Цябе забіць паслала.

Прыйшоў старэйшы брат
Адступніка зваладаць,
А я, як слізкі гад,
Зашыўся пад калоду.

Малодшы брат прыйшоў,
Ад помсты захлынуўся:
Шукаў, ды не знайшоў, —
Я ў гада абярнуўся.

І моцна кроў мая
Прывыкла ў гада ў плоці,
Застаўся гадам я
Па злой душы ахвоце.

І веру не вярну,
І сам з сабою б'юся…
Паўзу і голаў гну —
Упадзе ліст, баюся.

## КАРАНІ

Як на скрут галавы,
захацелася ўладу забраць
У жывых каранёў,
што ўрастаюць у долю глыбока.
Зашчымела ўва мне
першаісная сутнасць рабра,
Ад якога ўзяло
маё хцівае, хітрае вока.

То не ўлада,
калі
з каранёў не спагнаў, што жадаў,
Парасткі,
даўно над душою пасталі жаданні…
Падтачыў карані
і сваю ім уладу аддаў,
Быў я пэвен,
што хораша ім
пры маім панаванні.

Ды паблякла святло —
гэта помсты шукалі яны.
І не згледзеў,
як я
пры дзікунскай лучыне сляплюся
І не бачу сябе,
толькі чую —
галосяць званы,
І, як корань адсечаны,
ў бездань глухую валюся.

## КЛЮЧЫК

Згубіўся ключык згоды
З людзьмі,
якіх чакаў.
Халодныя, як лёды,
Я вочы напаткаў.

Наіўныя, як дзеці,
Адданыя, як смерць, —
Сябе,
з усіх на свеце,
Спяшалі зразумець.

І свету кус любовы
З сабою кожны нёс,
І кожны ўжо замовіў
Сабе прывабны лёс.

Мяне —
як не пазналі.
Каб не паганіць зрок?
І ключык утапталі
У помслівы пясок.

* * *

Зайсці ў мяне не проста,
Як без дзвярэй —
у вежу.
Я — сам.
І я да мноства
Ніколі не належаў.

Не маю я сурогаў,
Але не дам і шанца
З акрутнага былога
Залезці ашуканцам.

І збродзень,
                    што сягоння
З мяне вачэй не зводзіць,
Пры мне, як ля прадоння,
Пакуль не ўпадзе,
                    ходзіць.

Не стаўлю самаловаў…
Бо слова болей важыць,
Калі не хопіць словаў, —
Смерць за мяне дакажа.

* * *

Цяпло.
            А можна без цяпла
Любіць свае трывогі.
Калі мяцеліца мяла,
Я не сышоў з дарогі.

Цяпло.
            Ды, мусіць, не яно
Жыло ў маім настроі,
Нібы забытае кіно,
Дзе хто ні ёсць —
                    героі.

Паўдуркі, мудрыя…
                    Ды ўсе —
Ліхога часу рыскі.

Мой свет,
        сабраны пакрысе,
Расцягнуць васіліскі.

Цяпло.
      Мінецца і цяпло.
І ўсё маё мінецца.
А там,
      дзе ёсць дабро і зло,
Ізноў жыццё сатчэцца.

* * *

Бог не стварыў мяне сляпым,
Ані паганцам, ні брыдотай.
Я паламаў яго капыл
І ўсё прыдбаў уласным потам.

І вужаваў,
        і віжаваў,
Абы сваёй валодаць ратай,
І там штораз я выжываў,
Дзе іншы быў на глум распяты.

Дзе ўсе смакталі,
              я смактаў,
Пакуль апошні зуб не выпаў…
І нехта ўслед зарагатаў
І след мой попелам засыпаў.

* * *

Да крыла на паклон
Я лятаю начамі.
Цёмнай ночы прыгон
Ставіць пасткі між намі.

Лютай хмары сіло
На паўнеба віжуе.
Толькі веру,
                    крыло
Дзесь жыве
                    і вяшчуе.

Не птушынае, не,
А з нязбытнае плоці…
Хмару з месца скране
І па небе пакоціць.

Чысты шлях прад сабой
Не чакаў, што сустрэну,
Я наважыўся ў бой —
На крывавую сцэну.

Хоць якое,
                    ды зло
Мне павінна сустрэцца,
А ці ўздыме крыло,
Што так лёгка даецца?!

## АДЗІНОТА

На строме ў будане
шукаю адзіноты.
Лясная ціішыня
пакладзена на ноты.
І цэліцца з дупла,
як з мёртвага акопа,
Знервованы пагляд апошняга цыклопа.
А дзяцел не міне
падкінуць мне тыраду
Пра пэўную карысць
ляснога целаскладу.
Пад стромай
ручая нязвыклае сапрана
Для беднае душы —
як шторм для капітана.
І позняе расы
апошніх колькі кропель
Узнімуць на мяне
свой некласічны профіль.
Калі б не карані,
пабеглі б прэч ад пляшкі
Бярозкі за спіной —
што схімніцы-манашкі,
Бы я тут госць, а там —
прыслужваю ў тэатры
Той гадзіне,
што яд
падносіць Клеапатры.

Няўжо ўсяму вакол
перараказалі фаўны,
Што я, бы лёс і час,
народжаны бясслаўны.
І колькі ні жывеш —
ды нават з ласкі божай
Імгненнае адняць
у вечнага не зможаш.

* * *

У неспатольнай глыбіні
Мой патанок знікае.
І зайздрасць тузае:
«Цягні!
Там рыбка залатая!»

Нібы ў мяне ўбівае клін —
Між бедным і багатым.
А ў вуды нерв —
хоць і адзін, —
Бы ўсе мае,
напяты.

І калі лопне хоць які,
То плюну, не заплачу.
Відаць,
прыйшоў я да ракі
Шукаць чужую ўдачу.

І мне здалёк махне вятрак,
Зязюля пракукуе,
Што я без рыбкі той
ніяк
Сабой не рызыкую.

І бераг высцеле траву,
Каб сеў і схамянуўся:
А я ж, як жыў — і зноў жыву,
Хоць з рыбкай размінуўся.

## ВІНОВЫ ВАЛЕТ

Міргнуў няўзнак валет віновы
І, як не быў, між люду знік.
Дзяўчына скажа: «Хлопец клёвы…»
А я прамоўлю: «Жартаўнік…»

А ён наводдалі рагоча,
Уторыць нізкім галасам…
А кожны вольны,
хоць не хоча,
Ізноў адчуць,
які ён сам,

Бо як ні мар —
адносіць Лета
Далей ад звабы і прыўкрас…
І за віновага валета
Я не баюся,
як за нас.

## ГНОМ

Стой, малятка гном.
Дзе цяпер начуеш,
На каго крычыш,
для каго вяшчуеш?..
Барада — мая,
а пагляд чужацкі…
Пагубляў свае
на абмежку цацкі.
Хто падыме іх —
для сябе ўваскрэсне,
Ды ляжаць яны
на пяску — да плесні.
Паглядзіць багач —
усяго хапае;
А зірне бядак —
дзе падзець, не знае;
Прыляціць дзіця,
як даверу пташка,
Ды адразу ў плач:
не падыме — цяжка.

## СКРЫПАЛЬ

О, як мой слых здаўна казыча
Струна, якую не спыню.
Я для яе калісь пазычыў
Хірамантычнага агню.

І мой скрыпаль асветліў ноты,
На ўсе на іншыя забыў,
Зайграў мелодыю басоты,
Якою сам нядаўна быў.

І апантаных гукаў крозы
Маю аблытвалі юдоль.
А на смычку яго,
як слёзы,
Блішчэла гойна каніфоль.

## ГЛЕДЗЯЧЫ НА ЗОРНАЕ НЕБА

Танцуюць гномы зорныя,
Што феі ў дзіўнай казцы,
Такія бездакорныя —
Як персікі ў каўказца.

Усіх калёраў гамаю
Усмешка ператлела.
І добра, што душа мая
Яшчэ шукае цела.

Над стромымі ялінамі
Мізэрнеюць скрыжалі…
Яшчэ запасім гліну мы,
Яшчэ мы не стваралі.

А цені нашы —
вежамі,
Пахіленымі ў полі…

Яшчэ мы не належалі
Сваёй абрыдлай долі.

І цішыня абложная
Няблізка да развязкі.
І зорка, ды не кожная,
Шукае нашай ласкі.

## ГОРНАЕ ВОЗЕРА

На плячы патрэсканай гары
Возера выноснае плюскоча.
Хвалі,
          як з-пад неба званары,
Вечнасць немінучую прарочаць.

Не, прырода гэтак ці змагла б?!
І не разумею,
                    як санскрыту,
На крыле касмічнага арла
Водсвет традыцыйнага блакіту.

І не цямлю,
                што і да чаго, —
Душы тут нямеюць, як рабыні…
Монстры, што глядзеліся ў яго,
Стронгамі памеліся ў глыбіні.

## У НАЧНЫМ ЛЕСЕ

Грыб ужо вылезе
з гэтага хцівага моху,
Будзе язычыць
да рання над ім веташок.
Я не ўчакаю,
хоць можна ўчакацца спалоху,
Ў цьмяна-змяіных
пустой леснічоўкі вачох.

Ціш ачужэе.
А грыб на мяне азірнецца,
Як па кустэчы
я рушу далей ад тугі.
З ціхай пагардай
за мною грыбніца прачнецца
І развярэдзіць душу
дзікім пахам смугі.

Белую-чорную
выбера лісце акрасу,
Каб недагодна было
дакранацца рукой,
А на шчаку,
нібы горкую кроплю альясу,
Вечнасць ускоціць
свой самы трывожны спакой.

* * *

Калі б зіма,
калі б зіма была
Не гэткай несусветнай прыгажосцю,
Не ведаю,
ці памяць наракла б
Змяю змяёю,
а мілосць — мілосцю.

Яшчэ зіма.
І добра, што — яна.
А да спякоты,
як камусь — да пекла.
І кожны грэх відаць з майго вакна.
Калі світае,
то напраўду — светла.

## ПРЫЗНАННІ

Прызнанняў словы прыгалублены,
Не прычаканыя ні разу,
Я ведаў іх нібы аблупленых,
Не паспытаўшы іх экстазу.

Да непрыстойных і разбэшчаных,
Да паслухмяных і лагодных
Душа ляцела,
як да вечнага,
А павяртала
ў час зыходны.

У плыткай памяці схаваныя,
Іх адгалоскі прыляталі,
Недатыкальнаю мембранаю
Мой дух астатні казыталі.

Былі на вернасць —
не сурочаны,
Не адпісаны майму лёсу…
А што за іх было заплочана —
Усё са мною засталося.

* * *

Росна ля сцяжынаў крыжавых.
Плыткая рачулка не булькоча.
І туман, як чуйны вартавы,
Слухае, пра што трава шапоча.

Вадзянік, што любіць мятны пах,
Каліўцы халодныя збірае.
Адказаў камусьці позні птах,
Дзе шукаць
пакутны шлях да раю.

А русалка сушыць валасы
Ад свайго няўпынлівага плачу…
І здаецца,
праз усе часы
Я таемства большага не ўбачу.

* * *

*А. Малеву*

У парніках паспелі зоркі,
У парніках маіх жадункаў,
Як непрызнаныя акторкі
Усіх калёраў і гатункаў.

Сваю разбэсціўшы спатолю,
З зіркатай пільнасцю маньяка
Я па адной пускаў на волю
І па ніводнай не заплакаў.

А над апошняй, непрыгожай,
Начой схіліўшыся з паходняй,
Я перадумаў: «Будзеш рожай
Недаўгавечнай і халоднай…»

Мінула лета.
                    Сшэрхла восень.
Завея неба засцілае, —
І зорак там не засталося.
З усіх —
                адна мая палае.

## ПАЦАЛУНАК

На губах пацалунак далёкі,
далёкі,
далёкі,
Што калісьці апёк
і са мной развітацца не можа, —
Каб штодня цалаваць
незваротна-расстайныя крокі.
Асвяці ж іх, малітва,
не дазволь беспаметнасці, Божа.

Адцураюцца згадкі,
адцураюцца думы і мроі,
Толькі памяць не скажа
далёкай душы алілуя.
Запыні яе, Божа,
пацалуйся, як з роднай сястрою,
І яна, як мяне,
твой здарожаны крыж пацалуе.

* * *

Праз шклянку цёмнага віна
Глядзіць на вогнішча каліна.
Кахання наша даўніна
Каўтнута,
як сухая сліна;

Але ўва мне праз тлум хвілін
Чутна, як прыпавесць начная,

Нібы забыты андрагін
Мяне наноў распачынае.

Ў сухія жылы лье віно,
Каб кроў зацеплілася ў жылах…
А я даўнейшы ўсё адно,
А я такі,
як ты стварыла.

* * *

Не зведаць вуснаў,
толькі словы піць,
Адчуць віну,
ды не спазнаць адчаю,
І свой спакой прад Вамі
не любіць…
Душу да Вас,
як ляльку,
прывучаю.

Я Вашы вочы
бачу праз смугу,
Я цела Ваша
мрою скрозь дрымоту.
Прывабным быць,
як вораг, —
не магу,
Бяздушным быць —
няма людской ахвоты.

## НАВЕЛА

Сонца.
          Яснасць.
                    І мароз нясмелы.
Блізкіх слоў чародка гаманкая.
Гераіня даўняе навелы
На парозе дома сустракае.

Распрануся,
               выцягну з кішэні
І падам зробленыя грошы.
А яна з маленькай светлай жмені,
Як лушпінне, кіне іх у кошык.

І прыціхне,
               як пад снегам жыта,
Як пустэльны шлях перад вайною, —
Каб падумаць разам з пражытым
Пра яшчэ адно жыццё —
                              са мною.

* * *

Па розныя бакі
Мы цікавалі сонца.
Крычалі нам крукі,
Што нельга так бясконца.

Ды не пачулі мы,
Сябе паслухаў кожны:

Ты — бегла да зімы,
Я — у палон мурожны.

Я — сам сябе люблю,
А ты — і не дазнаўся…
Але ў адну зямлю
Навек з табой сабраўся.

* * *

А хмары-прыхадні віраць.
Начы абмежак даўні.
І толькі стомлена гараць
Агні начное страўні.

Мы з парку выйшлі на святло
Так хутка,
                    бы старэем.
А слоў, што гэтулькі было,
Зноў праказаць не ўмеем.

Ідзём,
          а цені нашы ўслед —
Як двое крылаў з раю, —
Шасцяць, шасцяць,
                                  нібыта свет
Хоць гэтак нам спрыяе.

І ўжо трываць не можа слых,
Кроў напінае жылы…

Але не ўзнімуць нас дваіх
Адны,
          хоць з раю,
                    крылы.

## МАЦЫЁЛА

Як толькі ўспыхне мацыёла
На вечаровым скразняку,
Сваё набожлівае сола
Мне,
          як паганскаму бажку,

Шаптацьме пахкімі губамі,
Хоць не бажок я,
                    а жабрак,
Што ўсеўся, збеднены, на камень
Перад вачамі ў разявак.

Яны глядзяць, бы на крамолу,
Што іх грахоўнасць выдае,
Як я цалую мацыёлу
У вусны пахкія яе.

І з неагляднаю віною
Чытаю воч яе санскрыт.
А шэры камень пада мною
Гарачы,
          як метэарыт.

* * *

Шукаю словы —
                              ўсе бяздарныя,
Непрычасаныя, бястварыя.
Тваймго нашэсця вочы карныя —
Маймго няшчасця вочы карыя.

Ступлю на ганачкі разьбяныя,
А ты глядзіш, як на бясполага.
А нада мной лятаюць зманныя,
Нібы насмешкі,
                              пёркі голуба.

І цішыня спакой выхоўвае,
І ад падслепасці далечвае
Скупы,
                    як воблака вясновае,
Абрыс аголенага плечыка.

* * *

І пыл той радзімны,
                              а горкі.
Ніяк не здалею забыць
На небе адзіную зорку,
Якую змаглі разлюбіць.

Да рання прыгадана столькі:
Хто згінуў, без следу прапаў,

Як даўкі дымок манапалькі,
Як пыл,
             што на зорку апаў;

Хто збіўся з дарогі і веры
І кінуў па свеце сумніў…
І хто вы — яе кавалеры?! —
Я вашую зорку сасніў.

## ПАГАНСТВА

Халадэча.
                 Ажно перабрацца
Запрашае пры свой камінок
Белатварая панна з палаца,
Прад якою згінаецца цмок.

Абазнаныя ў розных навуках —
Як цвяліць,
                  як на попел кахаць, —
Запрашае цяпельца паслухаць
І абедзве душы зрахаваць.

Цмок ліслівы лучыны наколе,
І яна загарыцца сама…
А між намі —
                       шырокае поле,
Праз якое сцяжыны няма.

Хай чакае,
                    і з цмокам дурэе,
І глядзіць,
                    як гарыць абалонь…
А мяне яе далеч сагрэе,
Як забыты паганскі агонь.

* * *

Гэту ціхую карчомку
Мы за лесам напаткалі,
Ты — забыўшыся на жонку,
Я — на тых, што зацкавалі.

Азірнуліся і селі
На пашчэрбленыя лавы
І з ухмылкаю глядзелі,
Як цурчыць напой гаркавы.

«За цябе…» — ты ціха мовіў,
«За цябе…» — сказаў я ціха.
За спіною нехта кроіў
На кавалкі наша ліха.

Нам свайго хапала жалю,
І шкадобы нам хапала…
Нашы кубкі задрыжалі,
І ў напой слязіна ўпала.

Мы паволі ўсталі з лаваў,
За спіну сказалі: «Годзе!»
Са сваёй ліхою славай
Як хадзілі, так і ходзім.

## ДЗЕНЬ

### I

Несусветны дзень праплыў,
Нібы воблака паром.
Да прагоркіх гэтых сліў
Прыкаваны ціхі дом.

Запалю самлелы кнот
І да дня не патушу.
Месяц, праведны, як Лот,
Узіраецца ў душу.

### II

А было.
Вятрыска лез,
Расцвяліўшы свой экстаз,
У густы пачуццяў лес,
Нібы зычны гук у сказ.

Развінаючы крыло,
Выдзімаў слязу самум.
І няўтульна тут было
Нават Богу самаму.

III

Мы стаялі пры вадзе,
Кайна слухалі званец,
Распачаўшы кагадзе
Гэтым светам сатанець.

Монстры — донныя карчы —
Выплывалі з глыбіні…
І дзяўбала на плячы
Птушка лёсу нашы дні.

IV

І было.
              Куста шкілет,
Як навяглы супермен,
Вырываў з рукі букет
Незайздросных цыкламен.

Потым воля, як палын,
Сэрцы тузала, абы
Ведаў свет, як божы сын,
Што запомніць, што забыць.

V

Ценю нашага плашчак
Перакінем праз раку.
Час зыбаецца. Аднак
Не патрапіць даць руку.

А пяройдзе на той бок
І пачне на нас гырчэць —
І пацвельвацца знарок, —
Як падсвінак на мячэць.

VI

Так, было.
                    Смакталі сок
Пад навіслым небам крон
І адпіхвалі квіток,
Прачытаўшы: «Флегетон».

Перазвоньвалася шкло —
Як ланцуг аб Калыму.
І нязвыкла тут было
Нават д’яблу самаму.

VII

А ручай паміж куп’я
Пачарнеў, як камінар.
І ніхто — ні ты, ні я —
Сам сабе не гаспадар.

Нашай шэрасці спічак
Не дастане да нябёс.
Скіне дзень святлісты фрак,
А пад ім —
                    чарнее лёс.

## VIII

Рызыкоўны час — паўзмрок.
Кнот патушыць слоў віхор.
Ды не дасць на здзекі зрок
Памяць — вызнаны суфлёр.

Творыць дня скупы партрэт,
Выпрабоўвае на слых:
Дзе хвіліна —
цэлы свет,
Дзе адвечнае —
як міг.

# ДОМ

## I

Двор абрыдлы.
Даміно.
Хоць вазьмі ды вызірай
Непагляднае вакно —
Дзверы ў пастку?
Дзверы ў рай?

Пойдзеш.
Грукне, як вырок,
За спіной бізун дзвярэй.
А насустрач — бы знарок —
Выбіраецца габрэй.

## II

Вось і я.
              Люстэрка ў твар
Гляне, бы ў душу эрэб.
Хохлік нам падасць узвар
Горкі,
          бытта старцаў хлеб.

Столь ніжэе.
                      Блізка столь…
Я расту?
              А можа, страх?..
Даядае ў куфры моль
І майго дзяцінства пах.

## III

Ложак — бруднае лагво,
Да якога лёс прывык.
Парушаю статус-кво,
Не магу стрымаць язык.

Хохлік спіць, разявіў рот,
Адыму ягоны сон…
Вынішчаю радавод —
Бы вясной ля вокнаў клён.

## IV

Вось і ты.
                 Бы клёнаў ліст,
Масянжовы твой загар.

Кот — адважны місаліз —
Да тваіх хінецца чар.

Стол.
        Кілішкі са слязьмі.
Два скрыжаваны нажы…
Прачынаемся людзьмі.
Ты — мая.
                Ды я — чужы.

V

Цвік.
        Парваны капялюш
На цвіку вісіць, бы жах.
Голас — наймiч нашых душ —
Не чуваць:
                ці ўцёк, ці спрах?

Цішыня — дачка начы —
Пачынае варажыць.
Хочаш праўды — памаўчы,
А маны — пра ўсё скажы.

VI

Вось і ўсё…
                    Пабіты ўшчэнт
Сподак з верай і цяплом.
Месяц бледны, як студэнт,
Асвятляе сонны дом.

І дзіўлюся, як дзіцё,
Што патрапіў на іспыт,
Дзе пытаецца жыццё,
Ды адказвае — нябыт.

## ДРЭВА

### I

З вышыні, і з даўніны,
І ў душы, і на зямлі
Што ні згадваю —
                              яны
Шэпчуць, кроны і камлі.

Не прыгадваю, адкуль
Узнікае дзіўны спеў;
Прызнаю адзіны культ —
Праз душу прарослых дрэў.

### II

На гары ці пад гарой
Узнімаецца яно, —
Ці блазнюк ты, ці герой,
Перад ім ты,
                    ўсё адно

Як нізрынуты тыран,
На калені ўпадзеш ніц,

Каб з яго гаючых ран
Праз жыццё паветра піць.

III

Ліст апошні ападзе.
Ты ўсміхаешся — стрыптыз.
Гэта свет ад нас крадзе
Часу пэўнага абрыс.

Хто маўчыць — ці дуб, ці граб?..
Аж пакуль не грымне гром, —
І памрэш,
                    калі ты раб,
Неўсвядомленым рабом.

IV

Не прагнаць здзіўлення з губ
І калісьці, і цяпер:
Што ні птах — то адналюб,
Што ні дрэва — старавер.

У малітву звонкіх крон
Сёння роспач ахіну,
Папрашу —
                    як прыйдзе скон —
На дуду і на труну.

V

Хворы ясень прарыпеў,
Што занудзіўся адзін.

Зноў і зноў находзіць спеў
Блізкіх Богу вяршалін.

Можа, свету я абрыд,
Што ўваслала ўсё зіма?..
Забываю краявід,
Калі дрэва ў ім няма.

## З ВЫШЫНІ БАЛЬНІЧНАГА ПАЛЁТУ

### I

Гэта белая сцяна —
Воку чорнаму радня.
Колькі нервы ні сцінай —
Будзе сніцца чарапня.

Клюгі рвуць са скроняў боль,
Прасціраддлы немач рве,
Бо здаўна твая юдоль
У Гігеі ў галаве.

### II

Праз дарогу — танчаць вальс:
Да душы не прытачыць.
Што лячыць — падкажа час,
Калі будзе як лячыць.

А пакуль — сцяна, як пляц,
Па якім хадзіў пагляд
Долю лепшую купляць,
Ды ні з чым ішоў назад.

III

Выйдзе з доктаркай спакой
У нямыты калідор,
Не, ніколі я такой
Не знайшоў бы ў свеце зор.

Ашуканы?
                Не, скупы:
Мог прыдумаць, што прысніў
Вочы, вусны…
                Ды на пыл
Перацёр яе наіў.

IV

Людцы!
                Што гэта са мной:
Дапаўзаю да вакна,
Покі сам не стаў сцяной
Ў плямах даўняга віна.

За вакном — суцэльны мур
Ды аплыты ясакар.
Як на птушак сам аўгур,
Пазіраю ў брыдкі твар.

V

Перным водарам з-за шкла
Аддае ў душу мурог.
Хоць бы доктарка зайшла
Хоць напраўду, хоць знарок.

Хай бы восень за вакно
Не блюзнерыла штодзень —
Мо была б хвароба сном
І мяне цураўся цень.

VI

Усялякі свет наўкол.
Але досыць мудраваць,
Калі можа кожны ўкол
У жывую кроў пляваць.

Досыць выць, крычаць, бубнець,
Што акрутны лёс міне.
Цела можна зразумець,
А сябе ў тым целе — не.

VII

А сябе аддаць на здзек
Толькі вылюдак аддасць.
Што ж,
            і Хворы — Чалавек,
Па якім пульсуе Страсць.

Што ж,
і белая сцяна —
Вока чорнага прасцяг…
Доўга ўздрыгвае спіна,
Як прабіты цемрай сцяг.

## МЕСЯЦ

### I

Заквець зорная.
З вакна
Позірк просіцца ў прасцяг.
Так далёка да відна —
Бы скарыць расстайны шлях.

Ды пракоціцца няўзнак
Нечы позірк па спіне.
Так павольна, як слімак,
Месяц хмарку абміне.

### II

І згадае месяц,
што —
Ні дагоднік, ні слугар —
Я трымаю паліто
І гляджу ў твой смелы твар.

Ды з яго бы нехта сцёр
Незагойны лёсу пыл…

Сукня ў кратку — як дакор
Мне за тое,
                    што сляпы.

III

Сонны бераст крактане
І ўсхвалюе цішыню.
Ходзяць наўцы пры вакне,
Покуль я не запыню.

Дзве ліцы і пракажу,
Покуль змога не кране.
З зор саскрэбвае іржу
Месяц проста на мяне.

IV

І напомніць месяц,
                                    як
Я цябе прывёў на Спас,
Я гатоўкаю, дзівак,
Заплаціць хацеў за час.

Прыбіраў у лепшы крам,
Словы літасці вучыў.
Замінялі душы нам,
Хвілі ў вечнасць несучы.

V

Касачы схілілі ніц
Незалежную красу.

Пах забытых камяніц
У далонях прынясу.

Вусціш.
            Прымхлівы званец
Прымаўкае каля верб.
Будзе месяцу балець,
Як і мне — ажно няўсцерп.

VI

І падкажа месяц,
                        дзе
Ад акрутнага кудмень.
І нарэшце ападзе
Вэлюм — з плеч,
                        пасля — з калень.

Цела палкае ў агні
Загараецца зырчэй.
Спыніць — Божа барані! —
Нецнатлівы бляск вачэй.

VII

Бразне зводдалі ланцуг.
Што за сон — сабачы сон.
Кожнай жылкі дзікі рух
Аддаляе крэўны скон.

Дзічка падае на дол,
Нібы куля на далонь.

Промні месяца, як пчол,
Адганяе грывай конь.

VIII

І запэўніць месяц:
мы
Шанавалі абразы,
Не прывыклі да гурмы,
Дзве душы — як два лязы.

Адзіноты ладны плот.
Мы з табой —
па два бакі.
Ад людзей і да істот
Ці ўтравелі бальшакі?

IX

Шыба лашчыцца, бы звер,
Аб гарачую шчаку.
Нечы цень, як чужавер,
Падцікоўвае ў садку.

Выйсці?
Выказаць прысуд?
Ці спыніцца на мяжы?
Зорка падае на груд
І згасае на крыжы.

X

І не скажа месяц,
                                    ці
Пабліжэлі мы да дня.
Патаўкліся па жыцці,
Як мурашкі каля пня.

Ці адродзім кайны род?
Ці народзім вечны зман?
Гэтак пахне дзікі мёд!..
А падзівішся — туман.

## НОЧ

I

Хоць і долю перайнач,
Выкінь злосць, нібы вазон, —
Гэта ноч — суцэльны плач,
Ненажэрная, як трон.

Плача сум і плача жах,
Плачуць радасць і спакой:
Рве на слёзы душы Бах
У фальварку за ракой.

II

А яшчэ… Сабачы брэх,
Вынішчальны, як закон,

Абароніць нечы грэх
І парушыць нечы сон.

Ды не слухае прыкмет
Голас чысты, як чацвер.
І народзіцца на свет
Столькі душаў — колькі вер.

III

Мы, як чорную ікру,
Пакаштуем ноч на смак.
Ты не вер майму «памру», —
Я сваёй душы мастак,

Я ньблізкі, як і скон…
Пачакаем пры вакне:
Чорны певень, як нямко,
Сад Каіфы абміне.

IV

Не, яшчэ не малачай
Прыхіляецца да ран.
Час — сусветны валачай,
Ноччу — бог, а днём — тыран.

Расхіне на вокнах цюль
І з крыві дастане соль…
І не ведаеш — адкуль
Заўтра зноў находзіць боль.

V

Дацвітае ночы хмель.
У дупліска чорны рот
Патрывожаны камель
Насыпае злосці шрот.

Бляск вачэй — як бляск слюды,
Яркі, ды без пекнаты.
Крык савы — як стрэл туды,
Дзе малы і дзе святы.

VI

Ноч змывае чорны грым
І губляецца ў гары,
Як апошні пілігрым
У пясках ля Бухары.

Што ляціць — душа, балід?..
Ці паспееш усачыць
Той апошні краявід,
Праз які жыццё прамчыць.

* * *

Дзе прыпыняюся — гэта яшчэ не супынак.
Лісце крывёю апошніх хвілін шалахціць.
Ці здагадаецца хтосьці: свабода — не вырак,
Што дазваляе сябе на няволю хрысціць.

Смешкі ў вачах.
Але ж тут — крымінальная радасць,
Што й сэрцаскоп не здалее
пазнаць і караць…
Дзе прызвычаюся —
ліст адцураецца падаць,
Быццам каштоўнасць
на безліч нявартных карат.

* * *

Хоць і ноч, ды мая…
Ацалелыя згукі вячэры,
Што даўно адбылася,
за дзесяць шляхоў ад мяне,
Урываюцца ў краты
маёй непрыбранай кватэры
На прыбраным, як госці,
галодным, як смерць,
гарцуне.
Калі хочаце ведаць —
на поўнач вакно расчыніце,
На раку,
за якою растаў ад цяпельца дымок:
Там адзіная зорка,
што ўмее казаць на санскрыце,
Там ўшчэнт саржавелы
з рыбацкае лодкі замок;
Не шукаюць там солі,
над юшкаю лес не варожа,

Варагуючы,
пні так зацята і крэўна маўчаць…
Калі што гэтай даўнасці
ўспомніць мяне дапаможа,
Ці змагу гэту ноч
з тое дзікае ночы пачаць,
З тумановай тугі
і гарачага твару наўпроці,
З далікатнага плёскату
ў сцішаных словаў вірах…
Калі б ведаў тады,
што агонь — з незгасальнае плоці,
Нарабляў бы душой —
на пачатак жыцця і працяг.
Ды гаркавы дымок
апаліў неслухмянае горла,
І казаныя словы тады —
і сягоння баляць…
А ці варт пачынаць,
калі нельга пачаць бездакорна,
Калі вогнішча тое
не можа і ў снах адпалаць.

ЗМЕСТ

Слова чыстае, як першы снег. *Алесь Марціновіч* . . . . . 5

## Без «Я»

***Па залатых валоках жыта… . . . . . . . . . . . . . . . . . 15
***Як доўга, як пакутна быць хвілінай… . . . . . . . . . . 15
Шалі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16
Пытанні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17
***Паветра ісціны бясконцай… . . . . . . . . . . . . . . . . 18
***Так павольна, як слімак… . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19
***Звіняць пераспелыя травы… . . . . . . . . . . . . . . . . 19
***Стары брукавы камень… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20
***Апошнія прывіды выйшлі з маёй даўніны… . . . . 21
Мы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
Памяць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23
***Птахі ў небе спыніліся… . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
***Даўно не стаяць прада мною… . . . . . . . . . . . . . . 24
***Доўга падае снег… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
***Ўваслаы рыдзелямі схілы… . . . . . . . . . . . . . . . . 26
***Заначэла. І неба ў садку не відно… . . . . . . . . . . . 26
Птаства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
Існасць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
***Апошні чацвер існавання… . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
***Віно не выпіта. Яно… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
Лес . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30

***Упэўненасць прыходзіць і мінаецца… . . . . . . . . . 31
Чаканне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32
***Так вусцішна, дзе светлае знікае… . . . . . . . . . . . . 32
***На прысмерку я ў ваш прашуся сон . . . . . . . . . . 33
***Мы не выйшлі з пячор… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34
Куля . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
Смех . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
***Пыл дарожны над полем… . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
У бальніцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37
***Гняло бяссонне. Сны не сніліся… . . . . . . . . . . . . 38
На кладах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 39
Вужы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
***Вось і ты, пара ні вясны, ні лета… . . . . . . . . . . . 41
***Мякка ступаючы, бытта распешчаны кот… . . . 42
Вецер . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42
Помста . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 43
Той, у магерцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
***А словы курчацца і круцяцца… . . . . . . . . . . . . . . 45
***Калясьмі праехалі па крозах… . . . . . . . . . . . . . . . 46
***Не, гэтак не клічуць, а просяць… . . . . . . . . . . . . 47
***Ссыльныя словы вяртаюцца… . . . . . . . . . . . . . . 47
***Зноў воблакі гастрольныя… . . . . . . . . . . . . . . . 48
Міф . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
Змена квадры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 50
***З абэцэды пракуднае долі… . . . . . . . . . . . . . . . . 50
Хвіліны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 51
***Хоць аднаві даўнейшы тракт… . . . . . . . . . . . . . . 52
***Высах вецер у разлогах… . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
***Дзень як дзень. Ды цямнець… . . . . . . . . . . . . . . . 53
***Вось і гэтая ноч-вераломніца… . . . . . . . . . . . . . . 54
Факстрот перасцярогі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
Люстэрка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56

***Анёлы ляталі знарок… . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
Бубнач . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
***Сустрэчны вецер абхапіў сілом… . . . . . . . . . . 58
***Блішчыць ставок, нібы чало… . . . . . . . . . . . . 59
***Зноў выпаў снег. Па цаліку. . . . . . . . . . . . . . . . 60
Старасць. Матыў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61
Дождж . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
Змярканне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
На ўзгорку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63
Вогнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
***Ачужэла душа з адзіноты… . . . . . . . . . . . . . . 65
Настроі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
Каханне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
На …-я ўгодкі Джульеты . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
Кніга . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
Пачуцці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70
Варажба . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
***Сцямнела. А пах багуну… . . . . . . . . . . . . . . . 72

## Хоць і ноч, ды мая

***Як на баль, апрануся дыхтоўна… . . . . . . . . . . . 75
***Вінаваты за тое, што ёсць… . . . . . . . . . . . . . . . . 76
***Вось і крэўнікі на дварэ… . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
Стары дзядзінец . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
***Як не сатлець ад боязі прызнацца… . . . . . . . . . 78
***Шукай, мой цэрбер, не драмі… . . . . . . . . . . . . . 79
Рукі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 80
***Пытанні, як абразы… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 80
***Над вадой тырчаць надмагіллі-палі… . . . . . . . . 81
На строме . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 82
Званец . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83

Чалавечына . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 84
***Паслядоўнік прыблуднай ідэі… . . . . . . . . . . . . 84
***Зноў пяе гусляр майго сіроцтва… . . . . . . . . . . . 85
Спакуса . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
***Лясное возера. Блакіт… . . . . . . . . . . . . . . . . . 87
Прысак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 88
***Мяняю час на попел… . . . . . . . . . . . . . . . . . . 88
***Пры святле адзінокай здагадкі… . . . . . . . . . . . 89
Ахвяра . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 90
Начная рака . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91
Сон . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 92
***Колькі раз прачынаюся… . . . . . . . . . . . . . . . . 93
***Атуляюць збыткоўныя крозы… . . . . . . . . . . . . 93
Капліца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
Першы снег . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95
***Самоты краскаю гаркаваю… . . . . . . . . . . . . . . 95
***У святлаценях дрэў намоклых… . . . . . . . . . . . 96
***Помню, месяц свяціў сярод дня… . . . . . . . . . . 97
Старцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
Вяргіні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
Голас . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 99
***Нібы струна аслаблая… . . . . . . . . . . . . . . . . . 99
***Кроў, ты наклічаш такія прыгоды… . . . . . . . . . 100
Тыран . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 101
***Голас мой катавалі… . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
***Асцярожна, калі падыду… . . . . . . . . . . . . . . . 102
Двубой . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
***Спякота. Постаць вудара… . . . . . . . . . . . . . . 103
Рызыка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104
***Я быў сягоння рызыкантам… . . . . . . . . . . . . . 105
***Я чэрап конскі прывалок у клас… . . . . . . . . . . 106
Фальварак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106

Пыл . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107
Пакуты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 108
Гад . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
Карані . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 110
Ключык . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 111
***Зайсці ў мяне не проста… . . . . . . . . . . . . . . . 112
***Цяпло. А можна без цяпла… . . . . . . . . . . . . . . 113
***Бог не стварыў мяне сляпым… . . . . . . . . . . . . . 114
***Да крыла на паклон… . . . . . . . . . . . . . . . . . . 115
Адзінота . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 116
**У неспатольнай глыбіні… . . . . . . . . . . . . . . . . 117
Віновы валет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 118
Гном . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 119
Скрыпаль . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 119
Гледзячы на зорнае неба . . . . . . . . . . . . . . . . . . 120
Горнае возера . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 121
У начным лесе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 122
***Калі б зіма, калі б зіма была… . . . . . . . . . . . . . 123
Прызнанні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123
***Росна ля сцяжынаў крыжавых… . . . . . . . . . . . . 124
***У парніках паспелі зоркі… . . . . . . . . . . . . . . . 125
Пацалунак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 126
***Праз шклянку цёмнага віна… . . . . . . . . . . . . . 126
***Не зведаць вуснаў, толькі словы піць… . . . . . . 127
Навела . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128
***Па розныя бакі… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128
***А хмары-прыхадні віраць… . . . . . . . . . . . . . . 129
Мацыёла . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
***Шукаю словы — ўсе бяздарныя… . . . . . . . . . . 131
***І пыл той радзімны, а горкі… . . . . . . . . . . . . . 131
Паганства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132
***Гэту ціхую карчомку… . . . . . . . . . . . . . . . . . 133

Дзень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 134
Дом . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 137
Дрэва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 140
З вышыні бальнічнага палёту . . . . . . . . . . 142
Месяц . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 145
Ноч . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 149
***Дзе прыпыняюся —
гэта яшчэ не супынак… . . . . . . . . . . . . . 151
***Хоць і ноч, ды мая… . . . . . . . . . . . . . . . . 152

Літаратурна-мастацкае выданне

**МАРУК** Уладзімір Антонавіч

**КУДМЕНЬ**

Вершы

Рэдактар *М. Н. Мінзер*
Мастак *М. Я. Шкурпіт*
Камп'ютарная вёрстка *В. А. Амельчанка*
Стыльрэдактары *Н. С. Пахомчык, В. А. Аляксеева*

Падпісана ў друк 22.08.2011. Фармат 70×90 1/32. Папера афсетная.
Гарнітура Garamond. Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 5,85. Ул.-выд. арк. 5,3. Тыраж 700 экз. Заказ .

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова
«Літаратура і Мастацтва».
ЛИ 02330/0494044 ад 03.02.2009.
Вул. Захарава, 19, 220034, г. Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства
«Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа».
ЛП 02330/0150496 ад 11.03.2009.
Вул. Чырвоная, 23, 220600, г. Мінск.